Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. АЎТОРАК № 197 (28055) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ГАНАРОВАЯ І АДКАЗНАЯ МІСІЯ

*Удзельнікам урачыстай цырымоніі адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі*

**Паважаныя госці і ўдзельнікі Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі!**

Ад усёй душы вітаю вас у Беларусі.

Тэхнічны форум такога глабальнага ўзроўню наша краіна праводзіць упершыню, што з'яўляецца ганаровай і надзвычай адказнай місіяй.

Сёння Міжнародная электратэхнічная камісія — гэта вядучая арганізацыя, якая вызначае тэхнічную палітыку ў сферы энергетыкі, электратэхнікі і электронікі. Правядзенне такога прадстаўнічага мерапрыемства стварае ўнікальную магчымасць для прафесійных зносін экспертаў, якія прадстаўляюць вядучыя сусветныя кампаніі.

Перакананы, што кожны з вас адкрые Беларусь не толькі як краіну з цудоўнай прыродай, але таксама як дзяржаву з сучаснай прамысловасцю і навукай, якія ствараюцца таленавітым, адукаваным і працавітым народам.

Зычу ўсім паспяховай працы і новых дасягненняў на шляху сусветнага навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## *ЛІЧБА ДНЯ*

## 537

## шматдзетных мінчанак

*узнагароджаны ордэнам Маці, паведаміла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА. Урачыстая цырымонія ўручэння гэтай высокай дзяржаўнай узнагароды яшчэ 22 мінчанкам адбудзецца ў Дзень маці 14 кастрычніка ў канцэртнай зале «Верхні горад». Штогод у сталіцы колькасць шматдзетных сем'яў павялічваецца ў сярэднім на 1 тыс. Цяпер на ўліку ў органах сацыяльнай абароны Мінска знаходзіцца 10 363 шматдзетныя сям'і. Траіх дзяцей выхоўваюць крыху больш як 9 тыс. сем'яў, чацвярых — 1 тыс., пяцярых дзяцей — 186 сем'яў. Ёсць у Мінску і сем'і-рэкардсмены, у якіх падрастаюць 10 (1 сям'я), 11 (2 сям'і) і 12 дзяцей (1 сям'я).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17162,00 | ▼ |
| Еўра | 19439,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 280,24 | ▲ |
| Укр. грыўня | 784,55 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

15197>

# ДЗЕНЬ БУДЗЕ СВЕТЛЫМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АБСАЛЮТНАЯ БОЛЬШАСЦЬ

## Краіна падтрымала дзейнага Прэзідэнта

**На прэс-канферэнцыі 12 кастрычніка кіраўнік Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія ЯРМОШЫНА пацвердзіла, што на выбарах Прэзідэнта Беларусі перамог Аляксандр Лукашэнка. Па папярэдніх звестках, ён набраў 83,49% галасоў. Сваю згоду з палітыкай гэтага кандыдата выказалі 5 095 156 чалавек. За Таццяну Караткевіч галасавалі 269 542 чалавекі, альбо 4,42% выбаршчыкаў. За Сяргея Гайдукевіча свой голас аддалі 202 325 чалавек, за Мікалая Улаховіча — 101 990.**

«За яго прагаласавала менш нават, чым подпісаў было сабрана ў яго падтрымку», — заўважыла Лідзія Ярмошына наконт лідара Беларускай патрыятычнай партыі. Старшыня ЦВК выказала думку, што такі вялікі адрыў трох кандыдатаў ад лідара гонкі тлумачыцца невысокай ступенню іх палітычнай вядомасці і пазнавальнасці ў грамадстве.

«Насельніцтва, скажам так, адчувала праблему з выбарам — у тым плане, калі выбар рабіўся не на карысць дзейнага кіраўніка дзяржавы, а разглядаліся іншыя варыянты, — сказала яна. — Адсутнасць аўтарытэту і прывяла да таго, што ў нас пратэснае галасаванне вышэйшае, чым галасаванне на карысць некага з альтэрнатыўных кандыдатаў».

Пратэснае галасаванне — гэта колькасць бюлетэняў з запоўненым радком «супраць усіх». Такіх па ўсёй краіне налічылі 390 376, альбо 6,4% ад усіх выбаршчыкаў. У Мінску «супраць усіх» прагаласавала больш за 20% выбаршчыкаў, якія прыйшлі на ўчасткі. Старшыня ЦВК прызналася, што такі высокі працэнт пратэснага галасавання стаў для яе нечаканасцю. «Думаю, што гэта пэўнае расчараванне тых, хто жадае перамен, але не бачыць годнай альтэрнатыўнай кандыдатуры», — пракаментавала яна тэндэнцыю.

Агучаныя ЦВК у панядзелак лічбы з'яўляюцца папярэднімі. Канчатковыя будуць названы ўжо ў гэтую пятніцу — пасля таго, як абласныя выбаркамы і выбаркам Мінска падпішуць выніковыя пратаколы аб галасах за кожнага кандыдата.

Згодна з апошнімі звесткамі, яўка на выбары Прэзідэнта склала 87,2% выбаршчыкаў. Гэта — 6 102 896 грамадзян. Гэтая лічба можа нязначна змяніцца, бо Цэнтральная камісія яшчэ не атрымала ўсіх сведчанняў пра галасаванне за мяжой.

У трохдзённы тэрмін кандыдаты ў Прэзідэнты могуць абскардзіць вынікі выбараў. Для гэтага яны павінны звярнуцца ў ЦВК. «І рашэнне ЦВК, калі яна адмовіць у такім прызнанні, з'яўляецца канчатковым. Калі Цэнтрвыбаркам прызнае вынікі выбараў несапраўднымі па асобным участку або цалкам па краіне, гэта рашэнне можна аспрэчыць у Вярхоўным Судзе», — патлумачыла Лідзія Ярмошына.

Каментуючы дзейнасць СМІ, **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** заўважыла, што журналісты цалкам выканалі сваю місію па асвятленні выбарчага працэсу. «Вынікі галасавання таму красамоўнае пацверджанне, — сказала яна. — Таксама хацела б сказаць, што выбары чарговы раз пацвердзілі, што краіна развіваецца дынамічна і ёсць падтрымка курсу Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*medvedeva@zviazda.by*



# ВІНШАВАННІ З ПЕРАМОГАЙ

**З перамогай на выбарах Аляксандра Лукашэнку павіншавалі лідары іншых дзяржаў.**

У прыватнасці, як паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны, адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі з Прэзідэнтам Расіі. Кіраўнікі дзвюх дзяржаў абмяняліся думкамі наконт маючых адбыцца сустрэч на двухбаковым узроўні ў рамках інтэграцыйных аб'яднанняў. Уладзімір Пуцін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі. «Упэўнены, што пад вашым кіраўніцтвам дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі дасягне яшчэ большых поспехаў, — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў Аляксандру Лукашэнку старшыня КНР Сі Цзіньпін. — Я надаю вялікую ўвагу развіццю кітайска-беларускіх адносін, даражу наладжанымі з вамі добрымі рабочымі адносінамі і асабістай дружбай». Старшыня КНР запэўніў, што гатовы прыкладаць сумесныя намаганні для таго, каб няспынна ўзнімаць кітайска-беларускія адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства на новую ступень развіцця на карысць дзвюх краін і народаў.

У тэлефоннай размове кіраўніка беларускай дзяржавы з перамогай на выбарах павіншаваў Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. Кіраўнікі дзвюх дзяржаў таксама абмеркавалі асобныя пытанні беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва.

Адбылася таксама тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам. Падчас размовы былі закрануты некаторыя пытанні беларуска-ўкраінскіх адносін. Кіраўнікі дамовіліся аб падтрыманні кантактаў па пытаннях, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Пётр Парашэнка павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Віншаванне паступіла і ад Прэзідэнта Венесуэлы Нікаласа Мадуры. У тэлефоннай размове Аляксандра Лукашэнку павіншаваў таксама Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл.

У адрас беларускага лідара працягваюць паступаць шматлікія віншаванні ад беларускіх і замежных палітыкаў, дыпламатаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і грамадскіх дзеячаў.

# ПРЫЯРЫТЭТЫ — НЯЗМЕННЫЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем ЛЕБЕДЗЕВЫМ.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што перажываў за становішча ў краіне. «Спроб было нямала, але, паколькі пра гэта ніхто не чуў, гэтага ніхто не бачыў, значыць усё-такі мы навучыліся ціха і спакойна працаваць, прадухіляць усякія інсінуацыі і спробы нават ачаговай дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Прыйдзе час, мы аб гэтых спробах раскажам, пакажам іх людзям, хай яны ведаюць», — дадаў ён.

Гаворачы аб прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што было зроблена ўсё, «каб нас ніхто не папракнуў, асабліва нашы заходнія партнёры, назіральнікі». «Я ўчора ў адкрытую вымушаны быў сказаць: ну што мы не зрабілі яшчэ, каб Захад нарэшце ўбачыў элементы дэмакратычнасці ў Беларусі? Шчыра кажучы, вядома, яны гэта ўбачылі. Іх справа, як яны гэта будуць падаваць», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падзякаваў місіі назіральнікаў ад СНД, якую ўзначальваў Сяргей Лебедзеў, за тую вялікую работу, якую яны правялі, і за іх аб'ектыўнасць.

Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама пытанні маючага адбыцца саміту СНД на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, які пройдзе 16 кастрычніка ў Казахстане.

Сяргей Лебедзеў павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. Ён праінфармаваў, што місія СНД, якая назірала за ходам выбарчай кампаніі, расцэньвае гэты вынік як высокі давер да дзейнага Прэзідэнта. Ён адзначыў, што місія СНД лічыць, што выбары прайшлі ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам і Канстытуцыяй Беларусі, а таксама адпавядалі агульнапрызнаным міжнародным нормам у правядзенні выбараў. «І самая галоўная выснова, якую мы зрабілі, — было забяспечана права грамадзян Беларусі на свабоднае волевыяўленне», — падкрэсліў Сяргей Лебедзеў.

Гаворачы аб маючым адбыцца саміце кіраўнікоў дзяржаў СНД, Сяргей Лебедзеў расказаў, што парадак дня налічвае 17 пытанняў.

На сустрэчы ішла размова аб пытаннях умацавання інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў Садружнасці, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Сяргей Лебедзеў выказаў удзячнасць Прэзідэнту Беларусі за падтрымку як Выканаўчага камітэта СНД, так і ў цэлым інтэграцыйнага ўзаемадзеяння.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў Сяргея Лебедзева, што Беларусь заўсёды была, ёсць і застанецца актыўнай прыхільніцай захавання і ўмацавання інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, павышэння яго эфектыўнасці.

# Унесены змены ў Дырэктыву №1

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №420 «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Дырэктыву Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».**

У адпаведнасці з дакументам прынята новая рэдакцыя Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны».

Ключавой асаблівасцю новай рэдакцыі Дырэктывы №1 з'яўляецца выразная ўстаноўка на фарміраванне адзіных падыходаў і сістэмную работу па забеспячэнні грамадскай бяспекі і дысцыпліны як на тэрытарыяльным, так і ведамасным узроўні, а таксама прыняцце дадатковых захадаў па зніжэнні гібелі і траўмавання грамадзян ад знешніх кіраваных прычын, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У сувязі з гэтым пашыраны пералік крытэрыяў ацэнкі выканання Дырэктывы №1. Адныні з іх прапануецца лічыць забеспячэнне здаровых і бяспечных умоў працы, прамысловай, пажарнай, ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту, фарміраванне правапаслухмяных паводзін, здаровага ладу жыцця, навыкаў па забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, у тым ліку ў падпарадкаваных (размешчаных на падведамаснай тэрыторыі) органах і арганізацыях.

Па ўсіх гэтых напрамках перад рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам пастаўлены дадатковыя задачы. Так, замацаваны абавязак дзяржаўных органаў па распрацоўцы і выкананні на галіновым і тэрытарыяльным узроўнях комплексных планаў мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі вытворчай дзейнасці і ажыццяўленні маніторынгу іх рэалізацыі. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму да 1 студзеня 2016 г. таксама даручана выпрацаваць і забяспечыць выкананне на падведамаснай тэрыторыі комплексу мер па ўмацаванні вытворча-тэхналагічнай, выканаўчай і працоўнай дысцыпліны, бяспекі вытворчай дзейнасці. Вынікі гэтай работы павінны штогод разглядацца на пасяджэннях выканкамаў.

Прадугледжаны шэраг іншых механізмаў забеспячэння здаровых і бяспечных умоў працы, вытворчай і грамадскай дысцыпліны, фарміравання асноў бяспечных паводзін грамадзян, зніжэння алкагалізацыі насельніцтва. Адлюстравана роля ў гэтай дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў, прафесійных саюзаў і іншых грамадскіх арганізацый.

Акрамя таго, прапісаны механізм кантролю і каардынацыі дзейнасці па выкананні патрабаванняў Дырэктывы №1.

# НЕ ПРОСТА НАЗІРАЛЬНІКІ

**Беларусь высока цэніць наданне ёй статусу назіральніка ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Мінску з генеральным сакратаром Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Дзмітрыем МЕЗЕНЦАВЫМ.**

«Думаю, для Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва мы з часам будзем уяўляць не проста вялікую цікавасць, а прынясём вялікую карысць гэтай арганізацыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў Дзмітрыя Мезенцава і ў яго асобе ўсіх членаў арганізацыі, назіральнікаў у ёй у тым, што яны не пашкадуюць, што павысілі статус Беларусі ў гэтай арганізацыі. «Я разумею, што для Беларусі зроблена выключэнне, мы не адносімся да азіяцкага рэгіёна, і гэта, напэўна, адзіная еўрапейская дзяржава, якая з'яўляецца назіральнікам у Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Для нас гэта вельмі важна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Гэта не проста чарговая пляцоўка для размоў, перамоў, хоць і гэта важна. Усё ж такі там гігантскія дзяржавы, гігантскія эканомікі. Гэта ўяўляе для нас вялікую цікавасць нават з практычнага пункту гледжання, не кажучы ўжо пра дыпламатыю, палітыку і г.д.», — адзначыў беларускі лідар.

«Таму мы вельмі высока цэнім тое, што сёння супрацоўнічаем непасрэдна ў гэтай арганізацыі з кіраўнікамі іншых дзяржаў, з іншымі дзяржавамі. Гэта будзе на карысць», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся думкай Дзмітрыя Мезенцава як кіраўніка місіі назіральнікаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі аб праведзенай кампаніі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што місія назіральнікаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва не знайшла ніводнага парушэння нацыянальнага выбарчага заканадаўства пры правядзенні выбараў кіраўніка беларускай дзяржавы. Ён звярнуў увагу на тое, што ўпершыню ШАС удзельнічала ў маніторынгу выбараў на тэрыторыі дзяржавы, якая мае ў арганізацыі статус назіральніка.

«І тыя сустрэчы, якія адбыліся са старшынямі ўчастковых выбарчых камісій, членамі камісіі, з выбаршчыкамі, з якімі мы размаўлялі, прадстаўнікамі ў тым ліку апазіцыйных партый і рухаў, паказалі, што гэта відавочна сёння для ўсіх: выбары прайшлі адкрыта, дэмакратычна. І выбары паказалі, што для грамадзян Беларусі права пагаласаваць за будучага Прэзідэнта ўспрымаецца як права ацаніць тое, што было зроблена дзейнай уладай, і, па сутнасці, пацвердзіць курс на ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё сваёй краіны», — адзначыў Дзмітрый Мезенцаў.

■ Абітурыент-2016

# РЭПЕТЫЦЫЯ ЭКЗАМЕНУ

## ...З РАБОТАЙ НАД ПАМЫЛКАМІ

**У беларускіх ВНУ стартаваў першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання. Пералік устаноў, дзе рэпетыцыя будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання, можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.**

Працэдура правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання нічым не адрозніваецца ад цэнтралізаванага: і колькасць заданняў у тэсце, яго структура, і час, адведзены на выкананне, і нават бланк адказаў на рэпетыцыі такія ж, як і на галоўным выпрабаванні. Праверкай тэстаў займаецца Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Ён жа забяспечвае ВНУ і тэставымі матэрыяламі. Задача арганізатара ў аўдыторыях — прытрымлівацца ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: прысутнасць мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі катэгарычна не дапускаецца. Арганізатарам дазваляецца кансультаваць удзельнікаў рэпетыцыі толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка, але ніякіх кансультацый па змесце тэстаў. Фактычна рэпетыцыйнае тэсціраванне — гэта шанц для абітурыента паспрабаваць свае сілы, выявіць прабелы ў ведах і крытычна сябе ацаніць, паколькі школьная адзнака далёка не заўсёды адлюстроўвае рэальны ўзровень падрыхтоўкі.

Да таго ж падчас так званай «рэпетыцыі» ёсць магчымасць набыць навыкі работы з тэстамі, што асабліва важна для абітурыентаў, якія скончылі школу даўно і мала знаёмыя ці ўвогуле не знаёмыя з тэставымі тэхналогіямі. Варта зазначыць, што ўдзельнічаць у рэпетыцыйных тэсціраваннях могуць і дзесяцікласнікі — ніхто ім гэтага не забараняе. Ніхто не абмяжоўвае і кола дысцыплін, па якіх можна прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне. Дарэчы, як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, часцей за ўсё вынікі першых тэстаў аказваюцца горшымі, чым пры паўторных спробах.

Да пачатку ўступнай кампаніі абітурыенты змогуць праверыць свае веды некалькі разоў. Першы раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання будзе доўжыцца да канца гэтага года. Другі раўнд пройдзе ў студзені-лютым. Трэці — у сакавіку-красавіку. Дарэчы, напрыканцы кожнага з этапаў усім удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў будуць прадастаўлены аналіз і рашэнне выкананага імі варыянта заданняў. Гэта форма працы практыкуецца ўпершыню.

Пачынаючы з кастрычніка, непасрэдна ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў для ўсіх ахвотных арганізуецца і камп'ютарнае тэсціраванне. Падчас яго прапануюцца заданні з той жа базы, што і на звычайным. Розніца ў тым, што абітурыент працуе перад камп'ютарным маніторам і напрыканцы выпрабавання можа адразу даведацца свой вынік. У абітурыента ёсць магчымасць тут жа папрацаваць над сваімі памылкамі. Спачатку да няправільна выкананых заданняў яму даецца падказка, а калі і яна не дапамагае, можна проста «падгледзець» правільнае рашэнне.

Кошт удзелу ў рэпетыцыйнага тэсціраванні (і камп'ютарным, і на папяровых носьбітах) складае 61 тысячу рублёў за кожны прадмет. На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў ужо адкрыта анлайн-рэгістрацыя на камп'ютарнае тэсціраванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# СОНЕЧНА, АЛЕ І ХОЛАДНА

## А ў другой палове тыдня крыху пацяплее і дажджы

**Ажно да чацвярга на тэрыторыі краіны захаваецца халоднае надвор'е, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці магчымы невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 5-11 градусаў. У сераду і чацвер таксама будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, пры праясненнях можа падмарозіць да мінус 6. Удзень чакаецца 4-11 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, далей на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць атмасферныя франты, а паўночныя вятры памяняюцца на паўднёвыя. Да нас завітаюць больш цёплыя, але вільготныя паветраныя масы, а тэмпературны фон крыху павысіцца. Цяплей стане менавіта ўначы. У пятніцу будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 5 цяпла, аднак па паўночным усходзе — 1-5 градусаў марозу. Удзень прагназуецца ад плюс 5 градусаў па паўночным усходзе да 12 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

І ў выхадныя амаль паўсюдна па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-9 цяпла, але па поўначы пры праясненнях чакаюцца замаразкі да мінус 2 градусаў. Удзень будзе плюс 5-12 градусаў, а па поўдні чакаецца нават да 13-14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ВЫБАРЫ ЛЕГІТЫМНЫЯ, ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ, ПРАЗРЫСТЫЯ І СПРАВЯДЛІВЫЯ

## Да такой высновы прыйшла місія назіральнікаў ад Кітая

**Назіральнікі за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі ад Кітайскай Народнай Рэспублікі выконвалі сваю місію на працягу чатырох дзён, уключаючы дзень асноўнага галасавання. Яны сустрэліся са старшынёй ЦВК, наведалі пяць выбарчых участкаў, пазнаёміліся з біяграфіямі кандыдатаў, працэдурай правядзення выбараў і падрыхтоўчай работы да іх.**


Фота БЕЛТА.

«Як мы бачым, арганізатары выбараў своечасова апублікавалі выбарчыя нормы і інфармацыю пра кандыдатаў у Прэзідэнты, эфектыўна забяспечылі права выбаршчыкаў на інфармаванасць, — зачытаў на рускай мове заяву місіі яе кіраўнік, **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі спадар ЮЙ Чжэньці.** — У місіі склалася ўражанне, што галасаванне праводзілася спакойна. Парушэнняў не было выяўлена. Выбары шырока асвятляліся беларускімі сродкамі масавай інфармацыі».

У сувязі з гэтым місія назіральнікаў ад Кітая лічыць, што «выбары адпавядаюць нацыянальным выбарчым законам Беларусі і агульнапрынятым нормам міжнароднага права, з'яўляюцца легітымнымі, дэмакратычнымі, празрыстымі і справядлівымі».

«Права на палітычнае волевыяўленне шляхам галасавання ў грамадзян Беларусі, якія маюць выбарчае права, цалкам забяспечана», — рэзюміруюць кітайскія назіральнікі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

# МІСІІ СНД І ШАС:

## парушэнняў адзначана не было

**Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі адпавядаюць дэмакратычным прынцыпам. Да такіх высноў прыйшла місія назіральнікаў ад СНД, заявіў журналістам кіраўнік місіі Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.**

«Місія назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў прыходзіць да наступнай высновы: выбары 11 кастрычніка 2015 года праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі, — сказаў Сяргей Лебедзеў. — Выбары адпавядалі дэмакратычным прынцыпам, былі празрыстымі, адкрытымі і канкурэнтнымі. Органы ўлады Беларусі і выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў забяспечылі ў ходзе выбараў рэалізацыю правоў грамадзян краіны на іх свабоднае волевыяўленне».

Да падобных высноў прыйшла місія назіральнікаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС): яна не выявіла ніводнага парушэння нацыянальнага выбарчага заканадаўства пры правядзенні выбараў кіраўніка беларускай дзяржавы. Пра гэта заявіў журналістам кіраўнік місіі назіральнікаў ШАС на выбарах Прэзідэнта нашай краіны, генеральны сакратар ШАС Дзмітрый Мезенцаў.

Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што ўпершыню ШАС удзельнічала ў маніторынгу выбараў на тэрыторыі дзяржавы, якая мае ў арганізацыі статус назіральніка. Ён паведаміў, што місія назіральнікаў пабывала ў Гродзенскай, Гомельскай, Брэсцкай, Мінскай і Магілёўскай абласцях на 59 выбарчых участках. «І для нас было вельмі важна адзначыць, што мы не выявілі ніводнага парушэння нацыянальнага выбарчага заканадаўства, — зазначыў ён. — І тыя сустрэчы, якія адбыліся са старшынямі ўчастковых выбарчых камісій, членамі камісіі, з выбаршчыкамі, з якімі мы размаўлялі, прадстаўнікамі ў тым ліку апазіцыйных партый і руху, паказвалі, што гэта відавочна сёння для ўсіх: выбары прайшлі адкрыта, дэмакратычна. І выбары паказалі, што для грамадзян Беларусі права прагаласаваць за будучага Прэзідэнта ўспрымаецца як права ацаніць тое, што было зроблена дзейнай уладай і па сутнасці справы пацвердзіць курс на ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё сваёй краіны».

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПАСЕ ГАТОВА СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ

## Абнародавана папярэдняя заява міжнародных назіральнікаў

**Міжнародныя назіральнікі за прэзідэнцкімі выбарамі ўчора выступілі з папярэдняй паслявыбарчай заявай. Прадстаўнікі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ), Парламенцкай асамблеі АБСЕ і Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) падзяліліся сваімі думкамі наконт правядзення гэтых выбараў у нашай краіне, а таксама абазначылі са свайго пункту гледжання пазітыўныя моманты мінулай кампаніі і яе недахопы.**

— Кандыдаты маглі весці агітацыйную дзейнасць па ўсёй краіне, — адзначыў на прэс-канферэнцыі, што арганізавалі міжнародныя назіральнікі ў Мінску ў першы дзень пасля выбараў, **Кент ХАРСТЭД, спецыяльны каардынатар місіі назіральнікаў АБСЕ на выбарах Прэзідэнта Беларусі.** — Такім чынам яны змаглі данесці свае погляды да выбаршчыкаў без якіх-небудзь абмежаванняў. Кандыдаты ў Прэзідэнты расказалі нам, што іх кампанію ў сродках масавай інфармацыі асвятлялі на раўнапраўных умовах.

Кент Харстэд таксама канстатаваў, што беларускія СМІ забяспечылі грамадства інфармацыяй пра выбарчую кампанію. Разам з тым ён заўважыў, што некаторыя чыноўнікі і прадстаўнікі ўлады ажыццяўлялі агітацыю ў падтрымку дзейнага Прэзідэнта ў працоўны час.



**Жак ФОР, кіраўнік місіі БДІПЧ АБСЕ,** звярнуў увагу на той факт, што васьмі зарэгістраваным ініцыятыўным групам была дадзена магчымасць ажыццяўляць збор подпісаў па ўсёй краіне. Ён зрабіў акцэнт і на гендарным складніку: упершыню ў гісторыі Беларусі сярод кандыдатаў была жанчына, у складзе выбарчых камісій, па назіранні Жака Фора, таксама шмат жанчын. Кіраўнік місіі БДІПЧ АБСЕ, як і, дарэчы, усе выступоўцы, з задавальненнем адзначыў запрашэнне і гасціннасць з боку беларускай дзяржавы, а таксама тое, што Цэнтральная камісія ўсё рабіла своечасова і публікавала ўсе звесткі на сваім сайце.

Да недахопаў, на думку Жака Фора, можна аднесці тое, што дзве трэці ад нацыянальных назіральнікаў з'яўляліся прадстаўнікамі дзяржаўных арганізацый.

У сваю чаргу, **Рэха ДЭНЕМЕЧ, кіраўнік дэлегацыі ПАСЕ,** прызнаў, што механізм галасавання ў нашай краіне дастаткова празрысты, аднак ёсць недахопы ў працэдуры падліку галасоў.

— 11 кастрычніка выбаршчыкі мелі магчымасць зрабіць выбар празрыста ў прысутнасці шматлікіх нацыянальных і міжнародных назіральнікаў, — сказаў кіраўнік дэлегацыі ПАСЕ.

Ён таксама адзначыў, што не было ціску на выбаршчыкаў і назіральнікаў.

Рэха Дэнемеч зрабіў заяву, што ПАСЕ гатова супрацоўнічаць з Беларуссю ў рэфармаванні выбарчага заканадаўства. Па яго словах, выбары не зводзяцца да галасавання, гэта ўсеабдымны працэс.

Канчатковая справаздача місіі будзе абнародавана 27 лістапада.

Папярэдняя справаздача ад Міжнародных назіральнікаў змяшчае 61 пункт. Працэс галасавання станоўча ацэнены місіяй АБСЕ ў 95% выпадкаў. Агульная празрыстасць выбарчага працэсу атрымала негатыўную ацэнку ў 3% справаздач. «Услед за адкрытым і бесперашкодным запрашэннем прадстаўнікоў Міжнароднай місіі назіральнікаў за выбарамі адміністрацыя Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) праявіла добразычлівае стаўленне да міжнародных назіральнікаў, — гаворыцца ў адным з першых пунктаў справаздачы. — Камісія здзейсніла ўсю тэхнічную падрыхтоўку і прыняла ўсе рашэнні ў вызначаныя законам тэрміны».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### ◆ У рэгіёне

Узровень арганізацыі выбараў у Гомельскай вобласці быў вельмі высокім, аднагалосна сцвярджаюць назіральнікі місіі СНД. Як падкрэслівае каардынатар-назіральнік місіі СНД Валерый Трошка, выбары ў рэгіёне праходзілі ў штатным рэжыме, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь:

— Усё было арганізавана добра, людзі ішлі на выбары, як на свята, з самай раніцы. Я знаходзіўся ў Цэнтральным раёне Гомеля — парушэнняў выяўлена не было. Афіцыйная ацэнка ад місіі СНД будзе крыху пазней.

Старшыня выбарчай камісіі Арлоўскай вобласці Людміла Маркіна на выбарах Прэзідэнта Беларусі працавала ў місіі міжнародных назіральнікаў ад краін СНД. Ёй давялося ажыццяўляць назіранне на 39 выбарчых участках Буда-Кашалёўскага раёна:

— Выбары адбыліся, выбары сапраўдныя, з высокай яўкай выбаршчыкаў. Відавочна, для грамадзян Беларусі гэта самая важная грамадска-палітычная падзея ў жыцці краіны. Людзі ішлі галасаваць сем'ямі. Адзначу высокі прафесіяналізм і зладжаную работу членаў як участковых выбарчых камісій, так і тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, на якой мы ў канцы дня, пасля закрыцця выбарчых участкаў, таксама ажыццяўлялі назіранне за падвядзеннем вынікаў галасавання. Падлік бюлетэняў адбываўся адкрыта, з выкананнем усіх пратаколаў.

Прадстаўнік місіі назіральнікаў СНД Мэлсат Халімаў заўважыў, што ўчасткі для галасавання былі абсталяваны ўсім неабходным, у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі:

Назіральнікі місіі СНД выказалі падзяку ўладам Гомельскай вобласці за садзейнічанне па забеспячэнні іх дзейнасці. Усяго на Гомельшчыне маніторынг за выбарамі ажыццяўлялі 53 назіральнікі місіі СНД, 42 — місіі БДІПЧ АБСЕ і 7,3 тысячы нацыянальных назіральнікаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

### ■ На думку парламентарыяў

# СПАКОЙНА І ПА ПРАВІЛАХ

**Свае ацэнкі арганізацыі сёлетніх выбараў выказваюць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**



**Аксана НЯХАЙЧЫК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**

— Сёлетнія выбары прайшлі арганізавана. На мой погляд, усе кандыдаты мелі доступ да СМІ, маглі заявіць пра сябе і сваю праграму, правесці агітацыйныя мерапрыемствы. Выбаршчыкі з цікавасцю паставіліся да гэтай кампаніі. Выбары шырока асвятляліся ў сродках масавай інфармацыі, таму кожны грамадзянін ведаў, куды яму прыйсці і як прагаласаваць. Замежныя назіральнікі выказваюць розныя ацэнкі сёлетняй кампаніі, але, як той казаў, колькі людзей, столькі і думак. Вядома, хацелася б, каб афіцыйныя ацэнкі не разыходзіліся з тым, што назіральнікі казалі нам у нефармальнай абстаноўцы. Пры сустрэчах з намі эксперты з іншых краін адзначалі высокі ўзровень яўкі насельніцтва і празрыстасць працэдуры.



**Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах:**

— Гэтая кампанія паказала, як узрасла палітычная культура нашых выбаршчыкаў. Я наведваў многія ўчасткі і бачыў, што ўсё ішло спакойна, раўнамерна. Людзі не тупіліся, але і пуста не было. Такой колькасці назіральнікаў, як сёлета, не было ніколі. Асабліва з боку еўрапейскіх структур. Самае цікавае, што сур'ёзных заўваг падчас выбараў не гучала. Былі прыдзіркі да афармлення ўчасткаў, памылак друку ў спісах ці інфармацыйных бюлетэнях, але ў цэлым эксперты казалі, што працэдура праходзіць па правілах. Тое, што вынікі экзітполаў, праведзеных трыма арганізацыямі, амаль супадаюць, таксама сведчыць аб адсутнасці грубых парушэнняў падчас кампаніі. Мяне асабіста парадавала, што двое з кандыдатаў, якія прайгралі ў гонцы, прызналі вынікі выбараў і павіншавалі абранага Прэзідэнта. Гэта сведчыць аб высокай культуры самога працэсу.



**Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы:**

— Тое, што выбары прайшлі арганізавана, адзначалі многія назіральнікі краін СНД. Асобныя эксперты прызнаваліся, што ў Беларусі ёсць чаму павучыцца. Дастаткова поўна і аб'ектыўна сёлетняя кампанія падавалася ў СМІ. Што тычыцца еўрапейскіх назіральнікаў, то дзіўна было б чакаць, што яны ацэняць кампанію выключна станоўча. Мне здаецца, яны заўсёды шукаюць, да чаго б прычапіцца. Я быў на выбарчых участках у некалькіх раёнах — у Старых Дарогах, Пухавічах — і прэтэнзій не маю. Насельніцтва мела магчымасць выказаць сваю пазіцыю без абмежаванняў. ■

■ Меркаванне

# «КОЖНЫ ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ЛЁСЕ СВАЁЙ КРАІНЫ»



**Майкл МАРГУЛІС, прэзідэнт фонду «Духоўная дыпламатыя», міжнародны назіральнік са Злучаных Штатаў на прэзідэнцкіх выбарах у нашай краіне, упэўнены: важна берагчы тое, што ёсць. На яго думку, у нашай краіне, гэта разумеюць.**

— Для большасці людзей, з якімі я гутарыў, вельмі важныя стабільнасць, мір у краіне, — адзначыў ён у размове з карэспандэнтам «Звязды». — У вас побач Украіна — гэта прыклад таго, як выдуманая свабода скончылася крывёю, смерцю дзяцей. Няма ў іх ніякай свабоды. Як я сказаў іх кіраўніку, у вас людзі змяняюцца, але ўсё застаецца па-старому. Разбураць вельмі лёгка, як яны гэта зрабілі, а будаваць вельмі складана. У Беларусі — мір, няма хаосу, спакой. Можа, некаму падаецца, што тут дастаткова жорсткія формы ўлады. Але без іх, на маю думку, Беларусь не дасягнула б таго, што мае. Не бывае зусім дасканалай краіны, але тое, што ўжо ёсць, трэба цаніць. Ёсць такія крылатыя словы: што маем, не захоўваем, а страціўшы, плачам. Я хацеў бы, каб беларусы захавалі тое, што яны маюць.

Майкл Маргуліс назіраў за выбарамі Прэзідэнта нашай краіны ўжо некалькі разоў. Параўноўваючы мінулыя выбары і цяперашнія, ён заўважыў: сёння многія разумеюць, што любы бунт прыводзіць да крыві і гвалту.

— Зразумеўшы гэта, частка людзей перастала жадаць нейкіх змен, якія разбурылі б дзяржаву. Людзі разумеюць рэальную сітуацыю. Яны пачалі больш цаніць тое, што маюць.

Як міжнародны назіральнік прэзідэнт фонду «Духоўная дыпламатыя» пабываў на многіх выбарах у многіх краінах.

— Напрыклад, я быў на выбарах у Тайландзе, у В'етнаме. У Беларусі ўсё больш арганізавана. Адчуваецца, што людзі хацелі — якімі б ні былі вынікі выбараў, — каб не было блытаніны, каб не было зрыву выбараў, каб яны былі цывілізаванымі.

У ЗША галасаваць можна праз інтэрнэт, і многія проста забываюць пра выбары. Майкл Маргуліс лічыць, што гэта дрэнна.

— Ёсць групы, напрыклад рэлігійныя, якія лічаць, што яны не павінны цікавіцца палітыкай, — адзначае ён. — Гэта няправільна, таму што кожны грамадзянін павінен удзельнічаць у лёсе сваёй краіны. І калі нехта з-за ляноты, абыякавасці або пратэсту не робіць гэтага — дрэнна. Я, напрыклад, лічу рэформы Абамы няўдалымі. Але я павінен быць законапаслухмяным, павінен галасаваць. Тады становіцца зразумелай сітуацыя ў краіне.

Калега Майкла Маргуліса **Марк БАЗЕЛЕЎ, віцэ-прэзідэнт фонду «Духоўная дыпламатыя»**, таксама прыехаў назіраць за выбарамі ў нашай краіне і пабедаміў, што ў яго атрымалася пабываць недзе на 15 участках у розных раёнах сталіцы.

— Скажу так: любая краіна была б рада, калі б выбары былі арганізаваны на такім узроўні. Гэта былі вельмі высакакласна арганізаваныя выбары. З пункту гледжання арганізацыі ні ў кога не можа быць ніякіх прэтэнзій. Мне было вельмі прыемна назіраць спакойную атмасферу, ініцыятыўнасць выбаршчыкаў, якія прыходзілі галасаваць сем'ямі, асабліва прыемна было бачыць маладых людзей. Маладое пакаленне разумее важнасць удзелу ў такім працэсе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Геапалітычныя перспектывы

# ЯК СЯБЕ АДЧУВАЕ СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСЬ ПАМІЖ УСХОДАМ І ЗАХАДАМ

**Гаварыць пра ўнутрыпалітычныя падзеі, такія як выбары, мінаючы знешнія абставіны, немагчыма. Яны наўпрост уздзейнічаюць на ўсе сферы жыцця краіны і яе будучыню. Менавіта пра гэта разважалі эксперты падчас «круглага стала» «Беларусь у кантэксце геапалітычных рэалій» у дзень выбараў.**

## ЧУЖЫЯ КРЫЗІСЫ ЯК СВАЕ

На думку **Сяргея КІЗІМЫ, загадчыка кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктара палітычных навук**, у нашы дні Еўропа ўсё яшчэ ніяк не акрыяе ад сусветнага фінансавага крызісу і падзей, якія адбываліся цягам апошніх гадоў у Грэцыі. Калі першае можа паправіць паслабленнем еўра, то другое пагражае праекцыяй адмоўнага палітычнага сцэнарыя на Італію.

«Другой праблемай, вельмі актуальнай для Беларусі, з'яўляецца вайна ў цэнтры Еўропы — ва Украіне. Крызіс у ёй закрануў 46 мільёнаў чалавек. Гэта вам не якая-небудзь маленькая, незалежная краіна на ўскрайку, а цэнтральная і вялікая па плошчы дзяржава», — казаў Сяргей Кізіма. І дадаў, што канфлікт у нашай паўднёвай суседкі значна адбіваецца на адносінах паміж Еўрапейскім саюзам і Расіяй. Для Беларусі асноўны мінус у гэтым выпадку — значнае скарачэнне экспарту ва Украіну. І праблема не ў колькасці беларускіх тавараў ці іх якасці, а ў няздольнасці ўкраінцаў набываць штосьці, апроч тавараў першай неабходнасці. Да таго ж наша краіна прыняла даволі шмат бежанцаў з Украіны, «паставілася да іх па-чалавечы», прадаставіла сацыяльны пакет, што адмоўна адбілася на беларускім бюджэце.

На думку эксперта, украінскі крызіс «не мог не паўплываць на Расію». «Яна ўступіла ў сур'ёзнае супрацьстаянне з Захадам. Аднавілася халодная вайна. Расійскай эканоміцы гэта вельмі дорага абышлося ў плане эканамічных страт. За першы год — каля 250-300 мільёнаў долараў», — заявіў доктар палітычных навук. Ён лічыць, што гэтыя ды іншыя фактары ўздзейнічалі на тое, што ў Расію, нашага партнёра-лідара, знізіўся экспарт беларускіх тавараў.

Відавочна, гаворыць Сяргей Кізіма, што геапалітычны ландшафт для Беларусі за апошнія два гады змяніўся кардынальна. Гэта непазбежна адбілася на сацыяльна-эканамічным стане краіны.

## РАДЫКАЛІСТЫ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ПАДТРЫМКІ

«На жаль, апошнія два гады Беларусь знаходзіцца пад уздзеяннем украінскага крызісу, і ён, я думаю, надоўга», — выказаў такі прагноз **Юрый ШАЎЦОЎ, дырэктар Цэнтра праблем еўрапейскай інтэграцыі**, і дадаў, што сёння наша суседка мае праблемы не толькі палітычнага плана, але і, перш за ўсё, эканамічныя.

«Калі Беларусь зараз будзе ўцягнутая ў любога кшталту крызіс, паміж Расіяй і Еўропай узнікне якасна новая сітуацыя, якая на доўгі час забяспечыць двухполюсны раскол. І ён будзе значна глыбейшым, чым у часы «халоднай вайны», — лічыць эксперт. — Ад таго, ці ўтрымаем мы тут стабільнасць, залежыць лёс, можна сказаць, усёй Еўропы».

На яго думку, стан Беларусі ў міжнароднай супольнасці за апошні час значна змяніўся. «Да пачатку вайны ва Украіне Беларусь успрымалася на Захадзе як апошняя дыктатура ў Еўропе. Цяпер, калі канфлікт стаў рэальнасцю, шмат хто зразумеў, што стрымлівае даволі жорсткі рэжым у Беларусі. Я маю на ўвазе той радыкальны нацыяналізм і тыя дэструктыўныя сілы, якія ёсць не толькі ва Украіне, але і ў нас», — сказаў удзельнік «круглага стала».

Звяртаючыся да тэмы выбараў, Юрый Шаўцоў патлумачыў, што сёлета радыкальныя палітычныя сілы не атрымалі належнай падтрымкі. «Новыя магчымасці сталі галоўнай прычынай таго, што ў ходзе бягучай кампаніі нацыяналісты-радыкалы не атрымалі падтрымкі Захаду. Упершыню за 20 гадоў мы не ўбачылі таго, што прывыклі бачыць», — сказаў эксперт. Пад «новымі магчымасцямі» ён разумее тую сітуацыю, якая ўзнікла ў адносінах Беларусі і Захаду. Што ж тычыцца магчымасцей радыкальнай апазіцыі, то яны, у прынцыпе, вычэрпваюцца тым, што было на несанкцыянаванай акцыі 10 кастрычніка ў Мінску, лічыць дырэктар ЦПЕІ.



Фота БЕЛТА.

Тую ж ідэю падтрымлівае і **Аляксандр ШПАКОЎСКІ, дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя»**. «Гэта другая выбарчая кампанія Прэзідэнта Беларусі (першая была ў 1994 годзе), якая праходзіць без адкрытых палітычных экстрэмістаў сярод зарэгістраваных кандыдатаў у Прэзідэнты. Сярод цяперашніх кандыдатаў няма ніводнага палітыка, які б заклікаў перагледзець вынікі волевыяўлення грамадзян шляхам арганізацыі масавых беспарадкаў у сталіцы», — сказаў эксперт і дадаў, што гэта сведчыць аб змене тактыкі, але не мэты ЕС у дачыненні да Беларусі.

«Захад на працягу дваццаці гадоў паслядоўна адстойвае так званы каштоўны парадак дня. На яго думку, мы павінны змяніць свой палітычны лад, падыходы да кіравання эканомікай», — лічыць Аляксандр Шпакоўскі. Уступаючы ў перамовы з ЕС, мы мусім захаваць свой твар: «З аднаго боку, нам неабходныя прызнанне, зняцце санкцый, доступ да фінансава-крэдытных рэсурсаў, тэхналогій і інвестыцый. Але таксама трэба адстойваць наша права на існаванне ўнікальнай беларускай мадэлі, прыводзячы ў прыклад яе паспяховасць».

## БЫЦЬ СЯБРАМІ, АЛЕ ЗАСТАВАЦЦА САБОЙ

У сваю чаргу **Ігар МАРЗАЛЮК, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі**, разважаў пра супрацоўніцтва Беларусі і яе стратэгічнага партнёра — Расіі. Ён лічыць, што нашай краіне трэба яго працягваць, але пры гэтым нагадваць партнёрам, што мы ніколі не станем часткай іншай дзяржавы, а будзем захоўваць сваю незалежнасць.

«Расія з'яўляецца стратэгічным партнёрам і саюзнікам Беларусі. Саюз з Расіяй для нас вельмі выгадны і ў сацыяльным, і ў эканамічным, і ў палітычным плане. Гэта тое, што не падлягае аспрэчванню і не ставіцца пад пытанне беларускім кіраўніцтвам. Аднак, кажучы пра гэта, мы павінны памятаць, што Беларусь ніколі не была марыянеткай, як вельмі любяць казаць апаненты ўлады. Рэспубліка заўсёды мела сваю знешнюю палітыку, у аснове якой ляжаць нацыянальныя інтарэсы», — сказаў эксперт.

Прытым прафесар не аспрэчваў перспектыву развіцця адносін з Захадам. «Беларусь выступае за раўнапраўны саюз, за Вялікую Еўропу. Тут няма ніякіх супярэчнасцей», — лічыць ён.

На думку **аднаго са стваральнікаў праекта «Цытадэль» Юрыя ДЗЕРМАНТА**, падчас фарміравання сваёй пазіцыі на сусветнай пляцоўцы Беларусі трэба памятаць не толькі пра сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары, але і пра каштоўнасныя. «Ёсць пэўныя выклікі менавіта ідэалагічныя. Галоўныя рызыкі сёння — рост нацыяналізму ва Украіне і часткова ў Расіі. Таму ў Беларусі цяпер з'яўляецца новая місія ў межах усходнеславянскага свету і Еўропы... Гэта каштоўнасць сям'і, сваёй мясцовасці, культуры. А з іншага боку — моцны гуманістычны патэнцыял», — кажа эксперт.

Сёння гэта праяўляецца ў міратворчай дзейнасці краіны. Эксперт выказаў ідэю, што з цягам часу наша краіна зможа выступіць ініцыятарам антыфашысцкага фронту і ў той жа час фронту, які прытрымліваецца кансерватыўных каштоўнасцяў. Такім чынам будзе фарміравацца «здаровы каштоўнасны парадак» краіны.

## ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫЯ ПАВЕВЫ

Удзельнікі «круглага стала» закранулі непасрэдна тэму адносін паміж Беларуссю і Еўропай. «Цяпер у Беларусі ўзнікаюць унікальныя магчымасці быць мостам бяспекі паміж ЕС і ЕАЭС, стаць сувязным звяном паміж Усходам і Захадам, развіваць паміж імі ўзаемны давер. Перадвыбарчая кампанія адбывалася ў спакойнай абстаноўцы. Захад успрымае нас даволі роўна, — выказаў такую думку **Антон ДУДАРОНАК, намеснік начальніка ўпраўлення Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**. — Сёння мы бачым, што Захад наладжаны на супрацоўніцтва».

**Вадзім ГІГІН, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка»**, падкрэсліў яшчэ адну з асаблівасцей сёлетняй выбарчай кампаніі. «Я звярнуў бы вашу ўвагу на важнае адрозненне гэтай кампаніі ад тых палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Знешняя палітыка не стала тым водападзелам, які дзеліць кандыдатаў, палітычныя сілы на розныя лагеры: або вы з Расіяй, альбо вы з Еўропай», — сказаў эксперт.

Выступоўца звярнуў увагу, што ў праграмах кандыдатаў не робіцца стаўка на адзін з двух бакоў. На яго думку, гэта паказчык змены характару палітычнай барацьбы. «Сілы, якія спрабуюць падзяліць грамадства на тых, хто мае рацыю, і хто не, на заходніх і ўсходніх, на тых, хто з Расіяй ці з Захадам, яны маргіналізуюцца. Беларускі палітычны мэйнстрым накіраваны на кансалідацыю грамадства», — сказаў Вадзім Гігін.

Але мець завышаныя чаканні наконт выступлення адзіным фронтам нельга. «Могуць быць адрозненні, крытычныя моманты. Мы бачылі гэта ў ходзе выбарчай кампаніі. Не ўсё так было дабратворна», — адзначыў ён.

Аднак, на думку эксперта, адсутнасць водападзелу па пытанні знешняй палітыкі адрознівае Беларусь ад Малдовы і Украіны. «Гэта той новы трэнд, які, напэўна, у найбліжэйшы час палітыкі павінны імкнуцца ўмацоўваць для таго, каб любыя ультра, усё роўна з якога боку — левага ці правага, — заставаліся б маргінальнымі», — заявіў галоўны рэдактар «Беларускай думкі».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ПЕРАКАНАЎЧАЯ ПЕРАМОГА — СВЕДЧАННЕ КАНСАЛІДАЦЫІ ГРАМАДСТВА

**Штогод у Беларусь на традыцыйную міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш і на Дзень беларускага пісьменства прыязджаюць пісьменнікі з многіх краін свету. Сёлета ў лютым праводзіўся і міжнародны форум «Пісьменнік і час», у якім удзельнічалі літаратары з Расіі, Чарнагорыі, Казахстана, Азербайджана, Літвы і іншых краін. А ў верасні 2015 года замежныя госці сабраліся ў Шчучыне на «круглы стол» «Літаратурны працэс і інфармацыйнае грамадства», заснавальнікамі якога па традыцыі з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда».**

**Сёння замежныя літаратары актыўна віншуюць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку з бліскучай перамогай на выбарах. Слова — дастойным сябрам Беларусі.**



**Святлана АНАНЬЕВА, загадчыца аддзела міжнародных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. Аўэзава, літаратуразнаўца (Казахстан):**

— Беларусь уражвае стабільнасцю, сваімі міралюбівымі памкненнямі, жаданнем, цягай да спакою ў сябе дома і ва ўсім свеце. Ніякія кампраміссы не кладуцца на шалі, калі на парадку дня стаіць пытанне аб міры, мірным суіснаванні. І Беларусь у гэтым плане — яскравы прыклад для ўсяго свету. Несумненна, такая палітыка — заслуга Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі, які на чарговых выбарах атрымаў бліскучую перамогу. Казахстанцы віншуюць Аляксандра Рыгоравіча і ўвесь беларускі народ!



**Чынгіз Алі аглу, паэт, заслужаны дзеяч мастацтваў Азербайджана:**

— У мяне сярод беларускіх пісьменнікаў шмат сяброў. Я часта прыязджаю да вас у госці. Ведаю ўсю прыгажосць зямлі беларускай. Бываў у Белавежскай пушчы, бачыў вашы рэкі і азёры. Быў і ў Хатыні, пра якую цяпер пішу паэму. Мне здаецца, што я прыкіпеў душой і сэрцам да беларусаў. І я вельмі радуюся, што перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у вашай краіне атрымаў дастойны чалавек. Той лідар, які бачыць клопаты і трывогі ўсяго грамадства, якому да ўсяго ёсць справа, які не баіцца браць на сябе адказнасць і праяўляе сябе граматным, мудрым абаронцам усяго народа Беларусі.



**Эдвард МІЛІТАНЯН, паэт, празаік, старшыня Саюза пісьменнікаў Арменіі:**

— Віншую беларускіх пісьменнікаў, сваіх калег, віншую ўвесь народ Беларусі з завяршэннем выбарчай кампаніі. І — з перамогай Аляксандра Лукашэнкі. Партрэт вашай краіны, уладкаванне сацыяльнага і эканамічнага жыцця ў Беларусі — гэта тая работа, якая за апошнія дзесяцігоддзі праведзена менавіта пад яго кіраўніцтвам. І відавочна, што беларусы станоўча ацэньваюць плён такой дзейнасці. Зычу ўсім вам новых здабыткаў. Жадаю, каб і кожны з вас быў надзейным памагатым Прэзідэнта краіны ў дасягненні самых розных задач. Беларусам усё пад сілу! Вашы светлыя памкненні бачаць і ў Арменіі, і паўсюль, дзе толькі вас ведаюць.



**Слабадан ВУКАНАВІЧ, паэт, драматург, празаік, перакладчык (Чарнагорыя):**

— Мне радасна, што народ Беларусі ў выбары кіраўніка сваёй краіны прымае заўсёды самае разумнае рашэнне. Часта прыязджаючы ў Мінск да сваіх сяброў-літаратараў, наведваючы гарады вашай краіны ў час правядзення дзён беларускага пісьменства, я дзіўлюся, якія вы настойлівыя, руплівыя, здольныя да работы па ўзвышэнні сваёй краіны. Без разумнага кіраўніцтва такія здабыткі наўрад ці дасягальныя. Я люблю неймаверна сваю краіну, езджу па розных гарадах Еўропы, але душой і сэрцам — я з Беларуссю. Віншую Аляксандра Рыгоравіча з выдатнай і пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах!



**Любоў ШАШКОВА, паэтэса, публіцыст, перакладчыца, рэдактар аддзела часопіса «Простор» (Казахстан):**

— Я нарадзілася ў Беларусі. Шмат як паэт пішу пра нашу родную старонку. Але ўжо даўно жыву ў Казахстане. Ды прыязджаючы ў Беларусь, не адчуваю сябе госцем. Мне ўсё імпануе ў родным доме, мне ўсё па душы ў тых здзяйсненнях, якія адбыліся ў краіне за апошнія гады. Простыя людзі, мае землякі з Магілёўшчыны, Гомельшчыны, атаясамляюць гэты рух наперад з мудрай воляй Аляксандра Лукашэнкі. А простым людзям няма сэнсу крывіць душою. Я рада новай перамозе вашага Прэзідэнта. Ведаю, што з ім вы, беларусы, такія ж непераможныя, якімі былі вашы дзяды і прадзеды ў Вялікую Айчынную вайну.

**Запісаў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Прафесія дня

# САЦЫЁЛАГ НЕ ПАВІНЕН ПАМЫЛЯЦЦА

## На такой думцы сышліся ўдзельнікі «круглага стала», прысвечанага сацыялагічным апытанням

**На «круглым стале» «Сацыялагічнае суправаджэнне выбарчай кампаніі. Адказнасць сацыёлагаў перад грамадствам» удзельнікі — вядучыя сацыёлагі краіны — выказалі свае думкі наконт значнасці экзітполаў, а таксама дакладнасці той інфармацыі, якую яны прадастаўляюць. Заўважым, што «круглы стол» праходзіў паралельна самім экзітполам. Усе ўдзельнікі мерапрыемства сышліся на думцы, што калі апытанні на выхадзе з выбарчага ўчастка праведзены па ўсіх правілах, то пагрэшнасць будзе мінімальнай.**




Фота БЕЛТА.

### КАБ ІНФАРМАЦЫЯ БЫЛА АБ'ЕКТЫЎНАЙ

— Цяпер вельмі вялікая ўвага звяртаецца на прадстаўнікоў сацыялагічнай навукі, — адзначыў напачатку «круглага стала» **Давід РОТМАН, доктар сацыялагічных навук, прафесар, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — Не толькі таму, што сёння тры арганізацыі праводзяць апытанні на выхадзе з выбарчых участкаў, а яшчэ і таму, што менавіта сацыялагічныя даследаванні, іх паўната — да выбараў, падчас выбараў, пасля іх — адсочваюць абстаноўку ў краіне, настрой людзей.

На думку дырэктара Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў,

— У такім выпадку атрымліваецца вельмі адказная работа, — лічыць Давід Ротман. — Натуральна, калі сацыёлаг праводзіць даследаванне, то яго вынікі павінны быць абсалютна дакладнымі, а ў многіх выпадках яшчэ і аператыўнымі. Напэўна, для таго, каб органы дзяржаўнага кіравання, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні, народ — усе яны маглі атрымаць аб'ектыўную інфармацыю для прыняцця рашэння: нехта на ўзроўні дзяржавы, нехта —на ўзроўні асабістых планаў.

Паводле слоў Давіда Ротмана, сёлета людзі ахвотна адказвалі на пытанні інтэрв'юераў, што праводзілі экзітполы. Негатыўнай рэакцыі не назіралася.

**Ігар КАТЛЯРОЎ, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук**, пагадзіўся з тым, што адказнасць сацыёлага перад грамадствам узрасла, асабліва апошнім часам.

— На працягу апошняга паўгоддзя мы правялі некалькі вялікіх даследаванняў, вызначылі электаральныя густы самых розных слаёў грамадства, — звярнуў увагу выступоўца. — У апошні час беларуская сацыялогія накіравана не толькі на рашэнне тэарэтычных аспектаў, але і на аказанне практычнай дапамогі, рэкамендацый і органам дзяржаўнага кіравання, і розным іншым структурам. Наш Інстытут сацыялогіі пастаянна праводзіць прыкладныя сацыялагічныя даследаванні, заўсёды працуе з рознымі дзяржаўнымі структурамі, з бізнесам. І, як правіла, дае дастаткова цікавых рэкамендацый. Кожнае сацыялагічнае даследаванне заўсёды знаходзіць нейкія новыя моманты. Трэба адзначыць, што мы працуем не толькі падчас выбарнай кампаніі. Мы супрацоўнічаем са шматлікімі міністэрствамі, ведамствамі. Хачу сказаць, што мы задаволены працай з Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам культуры, Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Зараз ніводнае значнае рашэнне, ніводзін закон не праходзіць без сацыялагічнага суправаджэння.

Ігар Катляроў лічыць, што экзітполы зараз праводзяцца на добрым узроўні.

### ЦІ БЫЦЬ НАВУЦЫ ПРА ЭКЗІТПОЛЫ?

Падчас «круглага стала» падымалася пытанне аб вылучэнні ў айчыннай сацыялогіі асобнай галіны — сацыялогіі экзітполаў.

— У нас створаны перадумовы для аддзялення спецыфічнай галіны сацыялагічнай навукі — «сацыялогіі выбараў», і над гэтым трэба працаваць, таму што ёсць шмат матэрыялаў не толькі ў нашай краіне, але і ў іншых, — звярнуў увагу **Яўген БАБОСАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік НАН, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі НАН.** — Гэты напрамак дае аб сабе знаць у некаторых вельмі важных лічбах. Прынцыпова важным для разумення сітуацыі, якая склалася сёння ў краіне, з'яўляецца той факт, што нашымі даследаваннямі высветлена — 73,5% грамадзян краіны ўпэўнены: Рэспубліка Беларусь адбылася як самастойная і незалежная дзяржава. 70% грамадзян лічаць, што ў краіне выконваюцца асноўныя правы і свабоды асобы, без якіх выбараў не бывае, бо ў працэсе выбараў чалавек здзяйсняе свае правa і нясе грамадзянскую адказнасць.

Тое, што сацыялагічныя апытанні ў краіне праводзяцца на высокім узроўні, пацвярджае і **Мікалай СУХОЦКІ, кандыдат сацыялагічных навук, галоўны спецыяліст Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта.**

— Наш цэнтр пастаянна праводзіць апытанні, — паведаміў Мікалай Сухоцкі. — Найбольш вядомыя з іх — метадам стандартызаванага інтэрв'ю «твар да твару». Для гэтага апытання патрэбна рэспубліканская апытальная сетка, і ў нашага цэнтра яна налічвае больш за 600 інтэрв'юераў. На кожнае апытанне прыцягваецца ў сярэднім 80 чалавек.

Паводле слоў прадстаўніка Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта, гэта людзі, якія пастаянна працуюць і робяць гэта якасна.

— Мы за гэтым сочым, у нас дастаткова сур'ёзная сістэма кантролю іх працы, — паведаміў Мікалай Сухоцкі. — За звесткі, якія прадастаўляем СМІ, мы гатовы адказваць. Сёння ўзнімаецца тэма адказнасці сацыёлагаў. Натуральна, сацыёлагі не павінны памыляцца.

Мікалай Сухоцкі мяркуе, што за кожным сацыялагічным апытаннем павінна стаяць сур'ёзная праца.

### «ЭФЕКТ ІЛЖЭ-ЭКЗІТПОЛА»

**Дзмітрый НАВУМАЎ, дацэнт кафедры эканамічнай сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта**, працягваючы тэму таго, што сацыёлаг памыляцца не павінен, узгадаў выпадкі, калі звесткі ілжэ-экзітполаў негатыўна паўплывалі на сітуацыю ў дзяржавах.

— Мы можам атрымаць сітуацыю, якая ўтварылася ў Грузіі, калі даволі сумнiўныя вынікі экзітполаў прывялі да радыкалізацыі грамадска-палітычнага становішча і да вымушанага сыходу Шэварнадзэ, — узгадаў ён. — Гэтая сітуацыя магла б прывесці і да варыянта Казахстана, калі ў 2006 годзе адна з палітычных партый, выкарыстоўваючы сваю партыйную сетку, правяла так званы экзітпол. У выніку была вельмі змешчана выбарка. Тыя абсалютна неадэкватныя вынікі, якія былі атрыманы, выкарыстоўваліся ў палітычнай барацьбе.

Дацэнт БДЭУ нагадаў, як у 2006 годзе, калі ў Беларусі таксама праходзілі прэзідэнцкія выбары, была правакацыя пад маскай сацыялагічных службаў.

**«Зараз ніводнае значнае рашэнне, ніводзін закон не праходзіць без сацыялагічнага суправаджэння».**

— Тады была інфармацыя, што, маўляў, дзве міжнародныя арганізацыі праводзілі так званыя экзітполы, — адзначыў ён. — Як паказаў пасля разбор — найперш у навуковых колах — ніякага дачынення да сацыялогіі гэтыя структуры не мелі. Больш за тое, хто за імі стаяў, незразумела. Тое, што цяпер усе сацыялагічныя даследаванні праводзяцца толькі акрэдытаванымі арганізацыямі, абсалютна апраўдана.

Падчас «круглага стала» Дзмітрый Навумаў выказаў упэўненасць, што вынікі экзітполаў і вынікі ЦВК па галасаванні амаль дакладна супадуць. Так і атрымалася.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Падзея

# ФОРУМ ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ

**Учора ў беларускай сталіцы адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі (МЭК)**

**Паводле інфармацыі прэс-службы Дзяржстандарта Беларусі, удзел у гэтым найбуйнейшым тэхнічным і бізнес-форуме міжнароднага ўзроўню прымае сёлета звыш 1200 дэлегатаў больш як з 80 краін свету, якія прадстаўляюць вядучыя сусветныя кампаніі ў галіне электрычных, электронных і сумежных тэхналогій, міжнародныя, рэгіянальныя і нацыянальныя арганізацыі ў сферы тэхнічнага рэгулявання, стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці, а таксама навуковыя ўстановы.**

МЭК з'яўляецца арганізацыяй па стандартызацыі, якая вызначае тэхнічную палітыку, распрацоўвае і публікуе міжнародныя стандарты ў сферы электратэхнікі, электронікі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, энергаэфектыўнасці і аднаўляльных крыніц энергіі.

Наша краіна з'яўляецца паўнапраўным членам МЭК з 1993 года, удзельнічае ў працы яе тэхнічных камітэтаў і падкамітэтаў. Гэта дазваляе беларускім спецыялістам атрымліваць доступ да міжнародных стандартаў МЭК і іх праектаў, удзельнічаць у распрацоўцы гэтых дакументаў, ажыццяўляць галасаванне па іх прыняцці і, такім чынам, бачыць перспектыўнае развіццё патрабаванняў, якія будуць прынятыя на глабальным сусветным рынку.

# У плане — буйныя кантракты!

**XX Беларускі энергетычны і экалагічны форум пройдзе ў Мінску з 13 па 16 кастрычніка. Па словах начальніка ўпраўлення энергаэфектыўнасці Міністэрства энергетыкі Міхаіла МАЛАШЭНКІ, у гэтым годзе Беларускі энергетычны і экалагічны форум будзе ўключаць міжнародную спецыялізаваную выставу «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра» (EnergyExpo) і энергетычны і экалагічны кангрэс. Удзельнікаў форуму чакае насычаная дзелавая праграма, якая аб'ядноўвае адразу 20 мерапрыемстваў.**

Невыпадковым стала і тое, што форум пройдзе падчас 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі. Як адзначыў сакратар нацыянальнага камітэта, **дырэктар таварыства «Выпрабаванні і сертыфікацыя бытавой і прамысловай прадукцыі «БЕЛЛІС» Юрый ПАШЫК**, у гэтым годзе 20-ы энергетычны і экалагічны форум спецыяльна сумясцілі з працай Генеральнай асамблеі.

«Дзве гэтыя падзеі аб'ядноўваюць тэмы энергазберажэння, энергаэфектыўнасці і экалогіі. Таму на пляцоўках Генасамблеі будуць арганізаваны спецыяльныя форумы, дзе мы абмяркуем сучасныя тэхналогіі ў гэтых абласцях. Сюды можна аднесці напрамкі кшталту генерацыі энергіі на альтэрнатыўных крыніцах, захоўвання электраэнергіі, кіравання яе спажываннем. Не абыдзем увагай і пытанні абавязковых патрабаванняў у галіне энергаэфектыўнасці для прадукцыі, якая выкарыстоўваецца ў побыце, і парадак доступу яе на рынак ЕАЭС», — адзначыў Юрый Пашык.

Міністэрства энергетыкі падчас форуму разлічвае падпісаць некалькі пагадненняў аб супрацоўніцтве з замежнымі партнёрамі, у тым ліку ў сферы аднаўляльнай энергетыкі.

Як чакаецца, на выставе EnergyExpo будуць прысутнічаць каля 300 арганізацый з 15 краін свету. Упершыню ў выставе прымуць удзел 32 інавацыйныя кампаніі з Кітая.

# МАЛАДЫЯ НАПЕРАДЗЕ

**У сталіцы стартаваў форум маладых спецыялістаў у рамках 79-й Генеральнай асамблеі МЭК. На тры дні будучыя эксперты з 35 краін аб'яднаюцца і атрымаюць магчымасць прыняць удзел у развіцці міжнароднай стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці ў галіне электронікі і электратэхнікі. Сёлета ўдзельнікамі форуму сталі каля 70 маладых спецыялістаў.**



## АРГАНІЗАЦЫЯЙ ЗАДАВОЛЕНЫЯ

Падчас урачыстага адкрыцця форуму **прэзідэнт Міжнароднай электратэхнічнай камісіі Дзюндзі НАМУРА** адзначыў, што стратэгія МЭК заключаецца ў тым, каб развіваць новыя рынкі і тэхналогіі. Ён заклікаў маладых прафесіяналаў, якія праводзяць форум, арыентавацца на патрэбы сваіх кампаній і краін. У сваю чаргу, **генеральны сакратар МЭК Франц ВРЭЕСВІК** адзначыў, што стратэгія МЭК доўгатэрміновая, а яе місія — узмацніць сувязь з прамысловасцю. «Стандарты МЭК забяспечваюць больш хуткі доступ на рынкі і перадачу тэхналогій, якія распрацоўваюцца ў прамыслова развітых краінах. Гэта вельмі эфектыўна для бізнесу», — падкрэсліў ён.

Па словах Франца Врэесвіка, стандарты МЭК спрыяюць павышэнню задаволенасці спажыўцоў, а таксама забяспечваюць больш танныя тэхналогіі і лепшыя інвестыцыі ў іх. Таксама ён выказаў задаволенасць тым, як Генасамблея праходзіць у Беларусі.

«Арганізатары зрабілі вельмі шмат, і, на маю думку, яны зрабілі гэта на найвышэйшым узроўні. У адаптацыі міжнародных стандартаў Беларусь займае актыўную пазіцыю. Як і ў найбольш развітых краінах свету, тут гэтым пытанням надаюць вялікую ўвагу. Увесь тыдзень мы будзем абмяркоўваць мноства важных тэм у сферы энергаэфектыўнасці і энергазберажэння. Поле дзейнасці МЭК вельмі шырокае. Мы разглядаем дастатковую колькасць пытанняў, якія тычацца электронікі і электрычнага абсталявання. У нас запланаваны пасяджэнні 173 камітэтаў і падкамітэтаў. Многія з іх пройдуць падчас Генеральнай асамблеі, дзе мы будзем абмяркоўваць больш канкрэтныя рэчы, кшталту ахоўы навакольнага асяроддзя, развіцця сістэмы «разумных гарадоў», «разумных аўтамашын», — растлумачыў генеральны сакратар.

Форум маладых спецыялістаў будзе доўжыцца тры дні і ўключыць у сябе пасяджэнні, на якіх з прэзентацыямі выступяць прадстаўнікі МЭК, а таксама навучальныя праграмы і сесіі, працу ў групах. Удзельнікі атрымаюць магчымасць пашырыць свае веды аб дзейнасці МЭК, абмеркаваць актуальныя пытанні.

## ЧАТЫРЫ БЕЛАРУСКІЯ ЭКСПЕРТЫ

Беларусь на форуме прадстаўляюць чатыры спецыялісты. **Малодшы навуковы супрацоўнік Навукова-адукацыйнага цэнтра ЗВЧ-тэхналогій і іх метралагічнага забеспячэння, выкладчыца БДУІР Наталля ПЕЎНЕВА** адзначыла, што на форуме ў яе дваінь інтарэс.

«Я з'яўляюся прадстаўніцай цэнтра распрацоўкі ЗВЧ-тэхналогій; нам важна даведацца, якім стандартам павінна адпавядаць наша арганізацыя», — сказала яна.

Акрамя таго, Наталля Пеўнева плануе падзяліцца вопытам са сваімі студэнтамі. Таксама яна падкрэсліла, што правядзенне Генеральнай асамблеі МЭК у Беларусі вельмі важнае, паколькі гэта павышае не толькі ўзровень краіны на міжнароднай арэне, але і давер да айчыннай прадукцыі. Яшчэ адзін удзельнік, **вядучы інжынер ААТ «Выпрабаванні і сертыфікацыя бытавой і прамысловай прадукцыі «БЕЛЛІС» Мікалай МАШЭДА**, расказаў, што ў яго ўжо ёсць невялікі досвед у выпрабаванні прадукцыі.

«Тут магчыма вывучыць больш глабальны падыход, даведацца, як адбываецца распрацоўка стандартаў. Гэта вельмі добры вопыт, які дазваляе выявіць тонкасці працы ў сусветных спецыялістаў», — лічыць Мікалай Машэда ■



Фота БЕЛТА.

■ Лагістыка

# БЕЛАРУСКІХ ПЕРАВОЗЧЫКАЎ ПАДТРЫМАЮЦЬ

**Прадстаўнікі Міжнароднага саюза аўтамабільнага транспарту выказалі гатоўнасць аказваць падтрымку Беларусі ў сферы аўтатранспарту.**

З 1948 года МСАТ ажыццяўляе сваю дзейнасць больш як у 100 краінах. Яго місія заключаецца ў тым, каб садзейнічаць устойліваму развіццю аўтамабільнага транспарту, у тым ліку шляхам укаранення інавацый і прафесійнай падрыхтоўкі кадраў. Таксама саюз упаўнаважаны адміністраваць глабальную сістэму транспартавання грузаў, якая спрашчае працэдуры іх афармлення пры перасячэнні межаў.

**Генеральны сакратар МСАТ Умберта дэ ПРЭТА** падчас сустрэчы з **намеснікам прэм'ер-міністра Анатолем КАЛІНІНЫМ** адзначыў высокі ўзровень прафесіяналізму беларускіх аўтамабільных перавозчыкаў, якія займаюць вядучыя пазіцыі на рынку міжнароднага транзіту. Прадстаўнікі МСАТ і намеснік прэм'ер-міністра абмеркавалі пытанні развіцця аўтамабільнага транспарту і ролі Беларусі ва ўмовах інтэграцыйных працэсаў у рэгіёне, стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза, рэалізацыі ініцыятывы КНР аб стварэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

«Пры гэтым была адзначана магчымасць Беларусі стаць важным элементам такога пояса з улікам таго, што лагістычная сістэма актыўна развіваецца, а таксама стварэння Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, які можа стаць перавалачным хабам з Азіі ў Еўропу», — адзначылі ў прэс-службе беларускага ўрада.



Фота БЕЛТА.

Прадстаўнікам МСАТ падрабязна расказалі аб перспектыўных напрамках развіцця беларускага аўтатранспартнага комплексу, транзітнай прывабнасці краіны, улічваючы яе геаграфічнае і геапалітычнае становішча. Беларускі бок падкрэсліў значную ролю МСАТ у вырашэнні пытанняў развіцця аўтамабільных перавозак грузаў і пасажыраў, удасканаленні ўмоў працы аўтамабільных перавозчыкаў ■

■ Фінансы

# ПАГАСІЦЬ КРЭДЫТ ДАТЭРМІНОВА

**Найбуйнейшая фінансавая ўстанова краіны аб'явіла пра падаўжэнне акцыі па датэрміновым пагашэнні крэдытаў на ўмовах, вызначаных банкам, як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце. Пра гэта паведамляе прэс-служба Беларусбанка. Згодна з апошнім рашэннем яго адміністрацыі, гэтая акцыя працягнецца сёлета з 6 кастрычніка да апошніх дзён снежня.**

Трэба адзначыць, што датэрміновае пагашэнне крэдытаў у беларускіх рублях і замежнай валюце на фінансаванне нерухомасці і спажывецкія патрэбы было распачата Беларусбанкам сёлета ў красавіку. Умовы гэтай акцыі застаюцца ранейшымі. Так, пры адначасовым датэрміновым пагашэнні крэдытаў, аплата працэнтаў па якіх ажыццяўляецца раўнамернымі часткамі, крэдытаатрымальнікі гасяць толькі працэнты за бягучы месяц і вызваляюцца ад аплаты працэнтаў, якія налічаны і не выплачаны за перыяд карыстання крэдытам.

У выпадку датэрміновага пагашэння крэдытаў з аплатай працэнтаў за фактычны час карыстання крэдытаатрымальнікі вызваляюцца ад гашэння працэнтаў, якія налічаны і прад'яўлены да аплаты на дату канчатковага пагашэння запазычанасці па крэдытным дагаворы.

Спецыялісты банка ўдакладняюць, што прыняць удзел у акцыі могуць тыя, што атрымлівалі крэдыты на агульных падставах (не льготныя крэдыты) і ў якіх адсутнічае пратэрмінаваная запазычанасць па крэдыце і (або) працэнтах. Да канчатковага пагашэння запазычанасці па крэдыце кліентам неабходна звярнуцца ў службу крэдытавання насельніцтва ўстановы банка па месцы заключэння крэдытнага дагавора для афармлення датковага пагаднення да крэдытнага дагавора аб удзеле ў акцыі ■

**Матэрыялы паласы падрыхтавалі**
**Сяргей КУРКАЧ** *kurkach@zviazda.by*
**Ілья КРЫЖЭВІЧ** *kryzhevich@zviazda.by*

**ГП «Институт НИИСМ» сообщает, что 12.11.2015 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Минина, 23**
**СОСТОИТСЯ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:**

1. Принтер HLJ 3500. Начальная стоимость 706 635 руб.
2. Сервер Fujitsu Primergi TX200S6. Начальная стоимость 14 532 689 рублей.
3. Дисковый массив D-Link DNS-343. Начальная стоимость 3 083 103 рубля.
4. Копировальный аппарат Xerox 5225. Начальная стоимость 22 531 056 рублей.
5. Цифровая инженерная система OceTDS450. Начальная стоимость 13 142 332 рубля.
6. Ноутбук Asus k53sv. Начальная стоимость 3 968 059 рублей.
7. ПЭВМ Neolink intelEdition. Начальная стоимость 4 683 530 рублей за 1 шт. Количество – 2 штуки.
8. ПЭВМ Логос I3330. Начальная стоимость 5 272 099 рублей за 1 шт. Количество – 2 штуки.
9. ПЭВМ Логос I3330. Начальная стоимость 3 778 821 рубль.

**Имущество продается одним лотом и не подлежит частичной продаже. Сумма задатка – 1%, шаг аукциона – 5%.**
**Срок подачи заявлений (внесения задатка) – до 11.11.2015 г. Дополнительная информация по тел.: (017) 226-29-77, 226 27 23.**

**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:**
- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 3480324, 8670561, 3853348, 8673676;
- полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев» (2РН, 2РП) серии НС №№ 0008121, 0014928, 0018278;
- полис «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» (2РН, 2РП) серии БИ № 1350549. УНП 100782388

■ Заключэнне эксперта

# А ВАДЗІЦЕЛЬ ГОДНЫ?

## Хочаш за руль — прайдзі медагляд

**У кожным рэгіёне для гэтага ёсць свае медустановы, але сутнасць працэдуры можна зразумець і на прыкладзе 24-й гарадской паліклінікі спецыяльных медаглядаў, якая размяшчаецца ў сталіцы, але абслугоўвае не толькі мінчан. Загадчыца аддзялення па аглядах вадзіцеляў гэтай установы Вольга КАЛЕЧЫЦ знаёміць з падрабязнасцямі.**

### ПРА ЎМОВЫ

— Вадзіцельскія камісіі могуць адкрыцца ў любой установе аховы здароўя пасля атрымання адпаведнай ліцэнзіі. Склад такой камісіі даволі вялікі, яшчэ нядаўна ў яе ўваходзілі ўрачы-тэрапеўты, нарколагі-псіхіятры, гінеколагі, хірургі, отарыналарынголагі, афтальмолагі, неўролагі. Атрымаць такую ўкамплектаванасць у звычайнай паліклініцы няпроста. Праўда, у сакавіку гэтага года быў вызначаны іншы склад. **Цяпер абавязкова трэба прайсці агляд тэрапеўта, неўролага, оталарынголага і акуліста.** Іншыя вузкія спецыялісты прыцягваюцца да работы экспертнай камісіі па меры неабходнасці. Дапусцім, жанчына не наведвала цягам апошняга года ўрача-гінеколага па месцы жыхарства — яе можа абследаваць і наш спецыяліст. Гінекалагічны агляд захоўвае актуальнасць, таму што для жанчын-кіроўцаў існуюць пэўныя проціпаказанні — цяжарнасць звыш 30 тыдняў, анкалагічныя захворванні і інш. Вадзіцельскі агляд патрабуе і некаторых спецыяльных умоў абследавання. Патрабаванні да вастрыні зроку вадзіцеля больш жорсткія, вастрыня зроку правяраецца па табліцы Сіўцава: не толькі па літарах, але і па колцах.

### ПРА ЗАЛЕЖНАСЦІ

— Сёння кандыдат у вадзіцелі або той, хто праходзіць пераагляд, ужо асабіста не звяртаецца ў наркадыспансер, каб узяць пацверджанне, што не стаіць на ўліку ў гэтай установе. Мы самі накіроўваем туды анлайн-запыт. Калі атрымалі інфармацыю, што чалавек стаіць на ўліку па прычыне залежнасці ад алкаголю ці наркарэчываў, то наш псіхіятр-нарколаг выдае накіраванне на праходжанне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі наркадыспансера. Калі гэтая камісія здымае пацыента з уліку, ён можа прэтэндаваць на тое, каб сесці за руль. Паводле закона, усе, хто стаіць на наркалагічным уліку або мае псіхічнае захворванне, не дапускаюцца да ваджэння. Акрамя таго, калі ў паводзінах чалавека ўрач-спецыяліст вадзіцельскай камісіі заўважае нейкія асаблівасці, то накіроўвае на агляд да псіхіятра-нарколага.

### ПРА ЛАЯЛЬНАСЦЬ

— Да 1993 года патрабаванні медыкаў да стану здароўя пацыентаў былі больш жорсткімі. Не дапускаліся да ваджэння, напрыклад, людзі з асаблівасцямі святлоўспрымання, цяпер жа галоўнае — адрозніваць колеры святлафора. Значна вышэй для допуску былі і параметры зроку. Абсалютным проціпа-



казаннем з'яўляліся выпадкі страты прытомнасці.

### ПРА ЛІШНІЯ АБСЛЕДАВАННІ

— Тэарэтычна можна было б браць на ўзбраенне вынікі абследаванняў вузкіх спецыялістаў паліклінік па месцы жыхарства. Аднак ці магчыма падпісваць агляд, зроблены не табой? Акрамя таго, як высвятляецца, не бывае лішніх абследаванняў. Нярэдка назіраюцца пэўныя разыходжанні ў выніках. Штогод мы накіроўваем да тысячы жанчын на кансультацыю і лячэнне, сярод якіх трапляюцца і выпадкі з падазрэннем на анкалогію.

### ПРА ЎЛАСНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

— Нярэдка прычынай дарожна-транспартнага здарэння з'яўляецца парушэнне правілаў дарожнага руху, адцягванне вадзіцельскай увагі на нейкія дзеянні, напрыклад, на размову па тэлефоне, а падчас разбору ДТЗ вінаватыя сцвярджаюць, што ім раптам стала дрэнна. Чалавек спрабуе перакласці адказнасць на медыкаў. Калі на вадзіцельскай камісіі высвятляецца, што кіроўца некалі страчваў прытомнасць, прызначаецца дадатковае, вельмі грунтоўнае, абследаванне сардэчна-сасудзістай сістэмы, галаўнога мозга. Пры нармальных выніках абследавання даецца допуск да ваджэння.

### ПРА ДЫЯГНАЗЫ

— Калі яшчэ дваццаць гадоў таму практычна здаровых людзей на вадзіцельскай камісіі было не менш за 70 працэнтаў, то цяпер кожны другі мае якое-небудзь хранічнае захворванне, што можа быць звязана не толькі з ростам захваральнасці, але і з паляпшэннем якасці абследаванняў. Людзей, якія наогул не праходзяць агляд, — 0,2-0,3 працэнта.

### ПРА СУПРАЦЬПАКАЗАННІ

— Калі ў дзень візіту ў вас абвастрылася любое хранічнае захворванне або вы захварэлі на грып, то спачатку трэба закрыць бальнічны. Наяўнасць хранічнага захворвання можа быць супрацьпаказаннем для атрымання вадзіцельскай даведкі (артэрыяльная гіпертэнзія 3 ступені, эпілепсія і інш.), а можа абмяжоўваць тэрмін дзеяння гэтай даведкі.

**Штодня экспертную камісію ў 24-й паліклініцы праходзіць да 400-500 чалавек. Кожны трэці — навічок-кандыдат у кіроўцы, 32 працэнты сярод усіх вадзіцеляў — жанчыны.**




### ПРА ЧАСТАТУ

— Для вадзіцеляў грамадскага аўтатранспарту патрабаванні да здароўя больш жорсткія, і самі медагляды больш частыя — па дасягненні 50-гадовага ўзросту яны праходзяць камісію штогод. Абмежаванняў па ўзросце не існуе — хоць бы і ў 80. Але які б здаровы лад жыцця не вёў пажылы чалавек, у яго большая верагоднасць выявіць захворванне, якое можа быць супрацьпаказаннем для кіравання аўтамабілем. З узростам зніжаецца і вастрыня зроку, слыху. Прычынай зніжэння вастрыні зроку могуць быць катаракта, глаўкома, своечасовае лячэнне якіх дазволіць захаваць зрок і здольнасць кіраваць аўтамабілем.

### ПРА ЧЭРГІ

— Вадзіцельскі агляд — планавы. За паўтара месяца можна запісацца на сайце паліклінікі, па тэлефоне і непасрэдна ў паліклініцы, дзе ёсць спецыяльны журнал для запісу на наступныя два тыдні. Запіс неабходны для афармлення дакументаў у рэгістратуры, а далей у кабінеты ўрачоў-спецыялістаў выклікаюць па прозвішчы. Некалі працавала тры камісіі — цяпер іх шэсць.

### ПРА НОВАЕ

— Калі паміж вадзіцельскімі камісіямі вы мянялі адрас пражывання або рэгістрацыі, то з кожнай паліклінікі, да якой адносіліся, давядзецца несці выпіску. Наогул выпіска павінна змяшчаць інфармацыю аб зваротах ва ўстановы аховы здароўя па месцы жыхарства, а таксама вынікі штогадовай дыспансерызацыі — аналіз крыві і мачы, аналіз крыві на цукар, электракардыяграму. Вадзіцель можа прынесці вынікі дыспансерызацыі са сваёй паліклінікі, а можа прайсці на платнай аснове ў нас.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

### НЕ «АДБРАКАВАЦЬ», А РАТАВАЦЬ

Спецыяльныя медыцынскія агляды неабходны для выяўлення прыдатнасці да работы, захавання бяспекі працы, прадухілення распаўсюджанасці інфекцыйных і паразітарных захворванняў, пры паступленні на работу са шкоднымі, небяспечнымі ўмовамі працы, а яшчэ гэта медагляды кандыдатаў у вадзіцелі (і пераагляды кіроўцаў) транспартных сродкаў.

Медагляд для атрымання санітарнай даведкі можна прайсці ў 24-й паліклініцы.

Медагляд занятых на работах са шкоднымі і небяспечнымі ўмовамі працы — у паліклініках па месцы жыхарства або ў цэнтральнай паліклініцы раёна.

Агляды вадзіцеляў легкавога транспарту катэгорый A, B ажыццяўляюць 11-я гарадская, 33-я гарадская студэнцкая, 34-я паліклінікі, медсанчасць МАЗа, медцэнтр МТЗ, медцэнтр «Гарызонт».

— Работнік, які не прайшоў у вызначаным парадку медыцынскі агляд, не можа быць дапушчаны да работы, — адзначае **галоўны ўрач 24-й гарадской паліклінікі спецыяльных медыцынскіх аглядаў Ірына ЖАРЫКАВА.** — Парадак праходжання медагляду, як і пералік супрацьпаказанняў да работы, рэгулюе Міністэрства аховы здароўя. Не сакрэт, што чалавек з венерычнымі, інфекцыйнымі, паразітарнымі захворваннямі не можа працаваць у арганізацыях гандлю і харчавання, у галіне абслугоўвання, там, дзе захоўваецца высокая рызыка заражэння навакольных. Падчас медагляду даецца не толькі заключэнне аб прыдатнасці да працы, але і рэкамендацыі па здаровым ладзе жыцця, лячэнні. Калі падчас агляду на прафесійную прыдатнасць быў выяўлены дыягназ, які перашкаджае рабоце ў пэўных вытворчых умовах, мы даем рэкамендацыі па спыненні работы са шкодным фактарам або змяншэнні ступені яго ўздзеяння.

**Закрытое акционерное общество**
**«Белорусско-швейцарский банк «БСБ Банк»**

www.bsb.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 01 октября 2015 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.2015 г. | На 01.10.2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 231 245 | 202 832 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 37 762 | 56 478 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 274 821 | 293 093 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 564 673 | 273 478 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 309 994 | 230 937 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 44 633 | 59 433 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 9 407 | 1 876 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 348 | 15 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 341 217 | 291 669 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 1 524 | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 59 182 | 45 615 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 1 874 806 | 1 455 426 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 73 282 | 32 452 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 811 | 34 260 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 1 238 182 | 983 754 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 14 457 | 4 643 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 35 806 | 8 944 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 362 538 | 1 064 053 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 211 929 | 180 000 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 28 440 | 20 903 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 188 565 | 168 222 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 83 334 | 22 248 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 512 268 | 391 373 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 874 806 | 1 455 426 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**на 01 октября 2015 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.15 г. | На 01.10.14 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 62 330 | 58 346 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 18 885 | 16 884 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 43 445 | 41 462 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 135 643 | 111 424 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 20 322 | 13 418 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 115 321 | 98 006 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 12 114 | 10 985 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 4 596 | (547) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 161 971 | 52 481 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (1 418) | (6 741) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 58 735 | (35 615) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 9 488 | 6 259 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 141 510 | 129 493 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 777 | 3 241 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 140 495 | 104 786 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 28 155 | 12 584 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 112 340 | 92 202 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | 1 | 1 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | 1 | 1 |

**Руководитель** **Казбанов В.А.**

**И. о. главного бухгалтера** **Авраменко Т.В.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности,
выданная Национальным банком Республики Беларусь № 7 от 27.09.2013.
УНП 807000069.

***Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»***

**22 октября 2015 года**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Мостоотряд №88»**

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, второй этаж,**
**приемная руководителя.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О выплате дивидендов по результатам девяти месяцев 2015 г.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 16 октября 2015 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться: в здании управления на втором этаже, приемная руководителя.

Регистрация участников собрания с **10.30** до **10.55** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 22 октября 2015 года в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 15 октября 2015 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

***Наблюдательный совет***

УНП 100299744

# ЮШКА З ДУШОЙ,

## або У Глушы як дома

**На малую радзіму вядомага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча ў Глушу прыехалі тыя, хто любіць і паважае беларускія традыцыі. Унікальнасць фестывалю «Глушанскі хутарок» у тым, што ладзіцца ён на энтузіязме тых, хто тут жыве і працуе. Адны вязуць на продаж ураджай агародніны-садавіны, іншыя — мясную прадукцыю, трэція едуць паспяваць і сябе паказаць. Няхай яны і не сусветна вядомыя зоркі, але завесці публіку могуць з паўабароту. Бо шчырасць ідзе ад сэрца, а рэпертуар — з бабуліных і дзядулевых скарбонак.**



Наталля АДАМОВІЧ прывезла на свята творы свайго бацькі.

Усё адбываецца на маляўнічай пляцоўцы цэнтра народных рамёстваў, або так званага «хутара багача і бедняка». Сярод соснаў і дубоў узвышаюцца старадаўнія пабудовы. Непадалёк стаіць стараверская драўляная царква, дзе захоўваецца цудадзейны абраз святой Варвары. А крыху побач за дрэвамі хаваецца старадаўні млын. Калісьці тут збіраліся адкрыць вялікі этнаграфічны комплекс, але нешта не атрымалася. Затое месца для фестывалю народных промыслаў і рамёстваў лепш не прыдумаеш.

Далёка чуваць гукі гарэзлівага гармоніка і смачныя пахі прыгатаваных на свежым паветры беларускіх страў. Гэта галоўны арыенцір для тых, хто трапіў на свята ўпершыню.

— Налятай, гаспадынькі, на рыбу! Танней не знойдзеце. Тавар на зайздрасць — і сом, і таўсталобік, і белы амур — усе, як на падбор. Глядзіце, які шчупак, усяго 40 тысяч за кіло. Дзе вы яшчэ такія цэны бачылі? — ногі самі нясуць на заклікі гаваркога хлопца, які пад шыльдай «Ціхі вір» дэманструе зайздросныя на выгляд рыбіны.

Дарэчы, аграсядзіба «Ціхі вір», якой кіруе Рыгор Храменя, вельмі папулярны ў раёне аб'ект. Асабліва ў аматараў рыбалкі. «З закінутага балота мы зрабілі цудоўнае возера плошчай каля 22 сотак, вакол паставілі альтанкі, — хваліцца гаспадар. — А кухня ў нас наогул усім на зайздрасць. Такой смачнай юшкі нідзе не знойдзеце». Зварыў яе Фёдар Бязручка, чалавек шырокай душы, генератар ідэй і кухар ад Бога. Запамінайце рэцэпт. Спатрэбяцца вада, некалькі сярэдніх памераў бульбін, пажадана нярэзаных, чорны перац. Ставіце кацёл на вогнішча і чакаеце, калі крыху падварыцца бульба — яна пачне падскокваць уверх. Потым кідаеце ачышчаную цэлую цыбуліну і прыкладна праз 15 хвілін апускаеце рыбу. За некалькі хвілін да гатоўнасці дадаеце лаўровы ліст і молаты перац. Юшка павінна яшчэ крышачку патаміцца перад тым, як яе падаць на стол. «Але калі вы не паклалі ў яе кавалачак сваёй душы, смачна не будзе», — смяецца гаспадар.

Аляксандр Буйко з вёскі Дойнічава — вядомы ў раёне гарманіст, без яго жартоўных прыпевак не абыходзіцца ніводнае свята. На сёлетнім конкурсе ў Бабруйску «Грай гармонік» гарманіст заняў першае месца. «Раней са сваёй праграмай працаваў на вяселлях, аб'ездзіў увесь раён і нават праехаўся ад Гомеля да Калінінграда, — кажа ён. — Цяпер на такія падарожжы грошай не хапае, але форму трымаю. Аляксандра Буйко прызнаецца, што любіць свята «Глушанскі падворак» за народны каларыт.

*У свой час гэты фестываль як мясцовую ініцыятыву прапанавала старшыня Глушанскага сельсавета Марыя Сушчанка. Праект атрымаў фінансавую падтрымку ПРААН. Свята спадабалася і стала традыцыйным. Сёлета гасцей тут сустракалі ў шосты раз.*

Наогул цікавых асоб на «хутарку» дастаткова. На вочы трапляе дзядуля, які з лазы пляце лапці. Цікаўлюся, колькі каштуе гэта прыгажосць. «Усяго 50 тысяч?» — не веру сваім вушам і раблю заказ. Адзін лапаць ужо ёсць, якраз майго памеру, другі майстра абяцае зрабіць праз паўгадзіны. Хутка высвятляецца, што я своечасова да яго звярнулася. Па вырабы Аляксандра Гайшуна, жыхара вёскі Пятровічы, нават чэргі выстройваюцца. Вязаць лапці ён навучыўся яшчэ ў сваёй маці. Пасля вайны разам з трыма сваімі братамі хадзіў у школу выключна ў матуліных лапцях.

Аляксандр Арлоў — мясцовая славутасць. Яго майстэрня якраз і ёсць той дом ганчара, які ўпрыгожвае «Глушанскі хутарок». Па слядах бацькі пайшоў яго старэйшы сын Мікалай. Хлопцу 20 гадоў, і ён самы юны член Саюза мастакоў. Гліняны посуд і свістулькі Арловых разыходзіцца на фестывалі з вялікай хуткасцю. «Мы кожны раз прыдумваем нешта новае, — дзеліцца Аляксандр сакрэтам. — Аднойчы зрабілі з гліны герояў мультсерыяла «Ледавіковы перыяд». Размялі імгненна». Дапамагалі свайму настаўніку рэкламаваць тавар яго вучні. Пад кіраўніцтвам майстра працуе 14 школьнікаў з Глушы і двюх навакольных вёсак.

Ганаровы госць фестывалю Наталля Адамовіч, дачка пісьменніка, не прапускае ніводнага свята. На гэты раз яна прэзентавала мясцовай бібліятэцы нядаўна перавыдадзеныя кнігі свайго бацькі. Сярод землякоў на іх вялікі попыт. Тым больш што перавыдадзена найлепшае са спадчыны, з дапаўненнямі і каментарамі, рэдкімі фотаздымкамі. Прывезла яна таксама англамоўнае выданне. «У Лондане «Хатынская аповесць» выйшла пад назвай «Хатынь»,— дэманструе Наталля англамоўны асобнік у мяккай абгортцы. — Амерыканскі гісторык і спецыяліст па Усходняй Еўропе Цімаці Снайдэр напісаў да яе такую добрую рэцэнзію, што зацікавіліся нават французы і таксама збіраюцца выдаць кнігу на сваёй мове. У Брытаніі фільм «Ідзі і глядзі», які зняты па гэтай аповесці, лічыцца адным з лепшых кінатвораў ХХ стагоддзя».

— Свята выклікае вельмі цёплыя ўражанні, тут наогул не заўважаеш, як ідзе час, — прызналася Наталля Адамовіч. — У Глушы я адчуваю сябе як дома.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**
*zigulya@zviazda.by*

*Бабруйскі раён.*




Ідэйны натхняльнік Марыя СУШЧАНКА адсвяткавала яшчэ і дзень народзінаў.

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ПОЛАЦК — ДРУГАЯ СТАЛІЦА?..

## Пра гэта сёння мараць грамадскія актывісты і навукоўцы

**Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці. І калыска нашай веры. Менавіта тут жыў першы беларускі князь Рагвалод з дачкою Рагнедай. Яна, у сваю чаргу, першай прыняла хрысціянства. Тут сваю асветніцкую дзейнасць наладзіла жанчына, першая сярод усходніх славян прылічаная да святых, — Еўфрасіння Полацкая. З гэтага горада родам і першадрукар Францыск Скарына. Падаецца, гэтага дастаткова, каб горад мог прэтэндаваць на тое, каб быць значным пунктам на беларускай карце. Аднак спецыялісты з болем канстатуюць, што сучасны Полацк — усяго толькі раённы цэнтр, дзе мала што нагадвае пра былую славу і веліч. Горад варты большага, чым мае сёння, аднагалосна пагаджаюцца археолагі і архітэктары, горадабудаўнікі і гісторыкі, прадстаўнікі ўлады і грамадскія актывісты.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Праблемы аднаўлення старажытнага горада разглядалі ў Нацыянальным мастацкім музеі на пасяджэнні, якое арганізавалі Беларускі фонд культуры і Беларускі камітэт Міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) на чале з **Уладзімірам ГІЛЕПАМ** і Грамадская назіральная камісія пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, якую ўзначальвае **Анатоль БУТЭВІЧ.** Вяліся гарачыя спрэчкі, абмяркоўваліся розныя падыходы да магчымага аднаўлення і захавання горада.

Палачанін **Уладзімір ЦЯЛЕЖНІКАЎ** шэсць гадоў патраціў на тое, каб распрацаваць уласную канцэпцыю рэгенерацыі горада. Усё задуманае ён прадставіў у выглядзе наглядных малюнкаў і схем. А таксама з дапамогай фотаздымкаў праілюстраваў тое, што сёння знаходзіцца на некалькі значных месцах. Перад вачыма паўстала не самая радасная карціна: абрысы старога замчышча не праглядаюцца, дзесьці наім стаяць гаспадарчыя пабудовы. Калісьці прывабная для прагулак набярэжная цяпер схавана ад вольнага вока выпадковымі дамамі. Аўтар канцэпцыі прапануе свой план расчысткі тэрыторыі. Прызначае ён і тыя будынкі, якія сёння, чыста тэарэтычна, могуць быць адбудаваны наноў.

Спецыялістамі гэта новая канцэпцыя ўхвалена не была, бо пры яе падрыхтоўцы адсутнічалі навуковыя абгрунтаванні і даследаванні. Аднак усімі яна была ўспрынята як выклік: нешта трэба рабіць, каб вярнуць Полацку той статус, які належыць яму па праве.

**Найперш, чым нешта аднаўляць, трэба праводзіць гістарычныя даследаванні... А любыя іншыя дзеянні нам папросту не даруюць нашчадкі.**

— Калі я прыйшоў на гэту працу, зразумеў, што паўнавартасная дакументацыя па аднаўленні гістарычнага цэнтра Полацка адсутнічае, многія пункты існуючай праграмы не ўзгоднены з адпаведнымі спецыялістамі, — адзначыў **галоўны архітэктар Полацка ў 2008—2013 гадах Андрэй БАРАВІК**, які спецыяльна прыехаў на абмеркаванне. — Таму найперш свае высілкі мы накіравалі на карэкціроўку дэталёвага плана. Мы рады, што сёння маем магчымасць абмеркаваць гэту праблему ў сталіцы, бо на месцы нам часта не хапала супрацоўнікаў, якія маглі б рэалізаваць гэты праект.



Магчыма, удасца стварыць рабочую групу і атрымаць пэўную падтрымку ў выкананні праграмы.

**Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Ігар ЧАРНЯЎСКІ** канстатуе:

— Варта адзначыць, што канцэпцыя, прапанаваная Уладзімірам Цялежнікавым, — гэта ўжо трэцяя ці нават чацвёртая падача матэрыялу па Полацку. Першая — гэта дзяржаўная праграма развіцця Полацка і полацкага запаведніка. Другая — сучасная праграма развіцця Полацка. Гэтыя праграмы сёння не рэалізуюцца цалкам, выконваюцца пэўныя іх пункты, але ж не да канца. Была ідэя стварыць турыстычны маршрут «Сцежка Еўфрасінні Полацкай» — слушная прапанова, аднак і ёй трэба грунтавацца на навуковых звестках: захавалася яшчэ шмат элементаў, за якія можна «зачапіцца» і нават паставіць усё на добрую камерцыйную аснову. Полацк — шматпластавы горад. Ёсць вельмі старажытныя сведчанні гісторыі, ёсць бліжэйшыя да нас. Таму пачынаць працу трэба з гісторыка-архітэктурнага апорнага плана, пачынаючы з ХІ—ХІІ стагоддзяў і нават больш ранніх часоў.

Пра адсутнасць дастатковых навуковых даследаванняў казалі і іншыя спецыялісты. А без іх ніякае аднаўленне ўявіць папросту немагчыма. **Прарэктар Полацкага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар Дзяніс ДУК** заўважае:

— Усе мы вельмі хацелі б бачыць Полацкі Сафійскі сабор у такім выглядзе, у якім ён быў у ХІ—ХІІ стагоддзях, але адназіць яго менавіта так у нас не атрымаецца. Бо няма дакладнай інфармацыі пра тое, як ён выглядаў. Ёсць дзве навуковыя канцэпцыі аднаўлення сабора, аднак нават яны не стасуюцца паміж сабой. Калі мы правялі археалагічнае даследаванне падмуркаў Свята-Мядзьвеўскай царквы, то зразумелі, што тое ўяўленне пра яе колішні выгляд, якое мы мелі, не адпавядала рэчаіснасці, — высветлілася, што царква была зусім іншай. Таму найперш, чым нешта аднаўляць, трэба праводзіць гістарычныя даследаванні... А любыя іншыя дзеянні нам папросту не даруюць нашчадкі.

Ёсць у Полацку і тое, што перайшло ад старажытнасці да сучаснасці і ўсё-такі захавалася. Гэта гістарычны ландшафт — акурат такі, якім яго бачылі Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына. Вельмі важна яго зберагчы, не зруйнаваць неабдуманымі дзеяннямі. І, вядома, добраўпарадкаваць тэрыторыю, каб нішто не замінала любавацца старажытнымі валамі, дарогамі і вуліцамі. Сёння шматлікія краявіды горада папросту заслонены іншымі аб'ектамі. Нават Сафійскі сабор выглядае не надта велічна побач з усім тым, што яго атачае. Таму прапановы па раскрыцці, расчыстцы некаторых відавых пунктаў падаюцца надзвычай актуальнымі і, магчыма, патрабуюць не так шмат выдаткаў.

На пасяджэнні некалькі разоў гучала прапанова стварыць полацкую археалагічную экспедыцыю. Ёсць і адпаведная база для яе — Полацкі ўніверсітэт, яго прарэктар прафесар, доктар навук Дзяніс Дук, вакол якога маглі б гуртавацца іншыя даследчыкі. Аднак сам Дзяніс Дук заўважыў, што на базе ўніверсітэта археалагічнымі даследаваннямі Полацка яны займаюцца ўжо не адзін год — праўда, без ніякай фінансавай падтрымкі.

Напрыканцы можна прыгадаць тое, што ў суседніх з намі краінах існуе адразу па дзве сталіцы: гэта Масква і Санкт-Пецярбург у Расіі, Варшава і Кракаў у Польшчы. Іх жыхары надзвычай ганарацца гэтым. Ці не пара і нам пачаць працаваць на тое, каб Полацку, гістарычнай сталіцы беларускай дзяржаўнасці і хрысціянства, вярнуць былую веліч і належнае прызнанне сёння?..

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# «У асабістым жыцці Караткевіча былі велізарныя трагедыі»

## Пераможца Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Літаратурная крытыка» Дзяніс Марціновіч адкрывае малавядомыя старонкі біяграфіі пісьменніка

**Кніга, дзякуючы якой вікторыя ўсміхнулася гэтаму маладому даследчыку, называецца «Жанчыны Уладзіміра Караткевіча». Карэспандэнт «Звязды» вырашыла запытацца ў Дзяніса Марціновіча, якія таямніцы яму ўдалося адкрыць у прыватным жыцці Караткевіча?..**

Аўтар расказаў, што пісаць кнігу вырашыў невыпадкова. Яму на вочы трапіліся некаторыя супадзенні ў асабістым жыцці герояў Караткевіча некалькіх твораў. Галоўныя гераіні рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» і аповесць «У снягах драмае вясна» мелі аднолькавае імя Алёнка. Больш за тое, яны траплялі ў падобныя сітуацыі. Гэта адразу зацікавіла даследчыка, яму захацелася высветліць: з'яўляецца гэта супадзеннямі ці праўдай, і падобнае, магчыма, адбывалася з пісьменнікам.

У архіве ён знайшоў ліставанне Уладзіміра Караткевіча з яго сябрам, якое нікалі не публікавалася. Там было вельмі шмат фрагментаў пра жанчыну, якую з упэўненасцю можна было назваць прататыпам Алёнкі. Марціновіч убачыў, што фрагменты са свайго ліставання пісьменнік уключаў у раман, амаль не змяняючы. Такім чынам высветлілася, што Караткевіч напісаў гісторыю свайго ўласнага кахання.

«Увогуле я вельмі люблю даведвацца, што было ў сапраўднасці, — гаворыць Дзяніс Марціновіч. — Напрыклад, усе ведаюць, што Ганна Карэніна кінулася пад цягнік. Аднак у рэальнасці жанчына, якая была яе прататыпам, развялася з мужам і жыла са сваім абраннікам. Мне было цікава паглядзець, што насамрэч адбылося ў жыцці нашага класіка».

Пасля выхаду ў 2004 годзе ў газеце «Літаратура і мастацтва» серыі публікацый пад назвай «Паляванне на Алёнку» стала зразумела, што з гэтага можа атрымацца цэлая кніга. Аўтар узяўся за працу: часам пісаў больш актыўна, часам запавольваўся.

Паступова пачалі з'яўляцца дадатковыя звесткі. «Ёсць невялікая колькасць кніг пра Караткевіча. Напрыклад, успаміны Адама Мальдзіса, пэўныя іншыя крыніцы, і я выкарыстоўваў іх, — гаворыць Марціновіч. — Да таго ж працаваў у архівах — Беларускім дзяржаўным музеі-архіве літаратуры і мастацтва і аддзеле рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Акадэміі навук».

Выкарыстаў аўтар таксама і інтэрв'ю з жанчынай, якая вучылася з жонкай Караткевіча ў адным класе. Яна ўзгадала некаторыя дэталі.

Увогуле кнізе, якая сёлета перамагла на Нацыянальнай літаратурнай прэміі, папярэднічала іншая, якая выйшла ў 2012 годзе і называлася «Дон-жуанскі спіс Караткевіча». Дзяніс Марціновіч адзначае:

— Караткевіч у асабістым жыцці быў не такім шчаслівым чалавекам, як нам падаецца. Цікава чытаць яго раманы, дзе апісваецца каханне... Аднак ён узяў шлюб толькі ў 40 гадоў. У яго асабістым жыцці былі велізарныя трагедыі. Ён збіраўся ажаніцца, але нявеста загінула ў аўтакатастрофе літаральна перад вяселлем. Была другая гісторыя, калі ён меў універсітэцкае каханне, у Кіеве, але яны развіталіся. Праз пэўны час гэта жанчына сама напісала яму, прапанавала аднавіць стасункі. Караткевіч адчуў эйфарыю, шчасце, бо ўсе гады памятаў былую сяброўку. Але неўзабаве атрымаў ліст ад яе знаёмай, у якім паведамлялася, што яго каханая выйшла замуж за іншага.

У рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі» апісваецца каханне да Ніны Молевай — рэальнай жанчыны, якая жыве дагэтуль у Маскве. Яна была сапраўды ракавой прыгажуняй, таму Караткевіч перажываў супярэчлівыя пачуцці. «Яго вельмі натхнялі жанчыны, — адзначае Марціновіч. — Але ён не быў шчаслівым. Толькі калі пісьменнік нарэшце знайшоў жонку, усё змянілася. Аднак парадокс заключаецца ў тым, што яго найлепшыя тэксты прыпадаюць акурат на той час, калі ён быў нешчаслівы. Яго натхнялі душэўныя пакуты».

Калі знойдуцца новыя цікавыя факты, Дзяніс Марціновіч працягне распрацоўваць тэму асабістага жыцця Уладзіміра Караткевіча.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Старасвецкая мода

# НЕЯДОМЫЯ «КАЛАЧЫ» І КРЫЖЫ ПАМЕРАМ З ДАЛОНЬ

## Як выглядалі галаўныя ўборы і ўпрыгажэнні беларусак стагоддзе таму?

**Сучасныя дызайнеры выкарыстоўваюць у сваіх калекцыях капелюшы і хусткі, каб дапоўніць жаночы вобраз. Нашы продкі таксама насілі гэтыя аксесуары, але ў сваім выбары кіраваліся хутчэй не модай, а традыцыяй. Дзе на Беларусі жылі самыя экстравагантныя жанчыны, чаму на галаву адзявалі «гняздо бусла» і навошта так актыўна ўпрыгожвалі шыю?**



Падвічка *(злева)* і хустка ў Ляхавіцкім строі.

### ПАЗНАЦЬ ЗЯМЛЯЧКУ ПА ХУСТЦЫ

Традыцыйны жаночы галаўны ўбор не толькі прыкрываў галаву ад холаду ці спякоты. Па ім пазнавалі сацыяльны статус і сямейнае становішча беларусак. Вянкі, якія ніяк не хавалі доўгіх валасоў, насілі незамужнія дзяўчаты. На вяселле жанчына адзявала вянок у апошні раз і мяняла яго на намітку. Сваю прыгажосць замужнія кабеты паказвалі толькі дома, а таму іх галаўным уборам былі ўласцівы стрыманасць і сталасць.



Дзяўчына ў каптуры. Маладзечанскі раён.

— Вышыня ўбору, грувасткасць сведчылі аб высокім статусе. Валасы маглі падкладацца, як каркас, каб стварыць аб'ём, — расказвае **мастацтвазнаўца Алеся ДЗЕМІДЗЕНКА,** аўтар дысертацыі «Жаночыя галаўныя ўборы ў традыцыйных строях усходняга Палесся канца XIX — пачатку XX стагоддзя».

Самымі распаўсюджанымі ўборамі былі, вядома, хусткі і наміткі. Але ў кожным рэгіёне яны адрозніваліся кампазіцыяй арнаментаў і тым, як павязваліся на галаве. Жанчыны скручвалі хусткі ў чубы, намотвалі наміткі на каркас, пакідалі «хвост» тканіны са спіны. У асобных мястэчках насілі «калач» — хустку, скручаную ў валік. Цёплая хустка-абхінатка, якая закрывала галаву і стан жанчыны па пояс, грэла беларусак узімку. Дызайн убораў часам падказвала сама прырода. Напрыклад, хусткі-буслянкі. Праз махры, якія на вісалі над ілбом, яны сапраўды былі падобныя да гнязда бусла.

Для вырабу галаўных убораў выкарыстоўвалі лён, воўну і бавоўну.

— Самай якаснай лічылася тоненькая, як марля, ільняная тканіна, якая ішла на выраб святочнай сярпянкі, — адзначае мастацтвазнаўца. — Такое далікатна апрацаванае палатно выкарыстоўвалі мяшчанкі. Звычайная жанчына не імкнулася часта мяняць строй, таму для вырабу паўсядзённага адзення ёй больш падыходзіла тоўстая шчыльная тканіна, якая мела лепшую носкасць.

### ПАДУШКІ І КАШЫ НА ГАЛАВЕ

Для абрадаў у беларусак былі асобныя галаўныя ўборы. Падчас вяселля дзявочы вянок здымалі і надзявалі «завівала». Фактычна гэта вялікая намітка, памерам два на тры метры (увогуле даўжыня намітак магла дасягаць пяці метраў). Убор пакрываў галаву і насоўваўся на вочы. Канцы «завівала», накручаныя на «скалкі», падтыкалі за гарсэт, каб стварыць сілуэт з поўнымі высокімі грудзямі.

Вянок сустракаецца і на пахаванні. У беларускай традыцыі дзяўчат, якія не паспелі выйсці замуж пры жыцці і заўчасна памерлі, апраналі ў вясельны строй. Арнамент на адзенні і ўборы быў маркерам роду і нацыянальнасці. Лічылася, што паводле арнаменту жанчын пазнаюць на тым свеце сваякі. Пахаванне, дарэчы, адбывалася ў белым адзенні.

**У асобных мястэчках насілі «калач» — хустку, скручаную ў валік. Цёплая хустка-абхінатка, якая закрывала галаву і стан жанчыны па пояс, грэла беларусак узімку.**

Цікавы звычай — падвязваць наміткі пад бараду. Можа і жарт, але некаторыя кажуць, што гэта рабілася, каб прыкрыць рот балбатлівым жанчынам.

Самымі эксцэнтрычнымі былі мяшчанкі з Давыд-Гарадка. Пад свае высокія галаўныя ўборы, «падушачку» і «галовачку», яны падкладалі ўзбітыя валасы, каркас і нават сапраўдную падушку. Жанчыны маглі надзець на галаву плецены кош, а на ім завіць намітку. Убор давыд-гарадчанак і сёння застаецца загадкай для даследчыкаў. Ёсць думка, што такая традыцыя пайшла ад татар, якія некалі жылі ў гэтай мясцовасці.



Жанчына паказвае, як надзявалі «завівала».

— Цікавая з'ява — рагацістыя галаўныя ўборы, — кажа Алеся Дземідзенка. — Рабіліся каркасы пэўнай формы, хусткі падвязваліся так, каб тырчалі «рожкі». Беларусы ўводзілі казу і карову ў кола святочных персанажаў — узгадайце звычай пераапранацца на Каляды. Жанчыны, напэўна, хацелі асацыяваць сябе з такімі жывёламі.



Традыцыйныя ўборы давыд-гарадчанак. 1930-я гады.

### ТОЛЬКІ ПРЫРОДНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Упрыгожваць сябе жанчыны пачыналі з абшывання кашулі. Навошта бранзалеты, калі можна аздобіць рукавы брыжыкамі, а гарлавіну — каўняром? Гэта не пустое ўпрыгожванне, якое яно, магчыма, для сучаснага чалавека, а абярэгавае. Кожны чырвоны радок на кашулі ці фартушку засцерагаў чалавека ад злога. Нашы продкі верылі, што нават калі яны апранутыя, на целе застаюцца ўваходы для нечага нячыстага і брыднага. Таму невыпадкова гэтыя ўваходы — падол адзення, месцы заканчэння кашулі — актыўна насычалі чырвоным арнаментам, які дапамагаў адпужваць хваробы.

Модныя сёння накладныя каўнерыкі беларускі насілі яшчэ стагоддзе таму. Жанчыны таксама любілі надзяваць крыжыкі, ланцужкі з медальёнамі, каралі, пацеркі з пафарбаваных каменьчыкаў. Жыхаркі Брагінскага раёна ўпрыгожвалі шыю «пляцёнкай» — стужкай тканіны, на якую нашывалі бісер пэўным узорам (звычайна чырвона-белыя ромбы).

— Матэрыялы, з якіх рабілі ўпрыгажэнні, — гэта бурштын, каменьчыкі, гліна, падсушаныя ягады, косткі, дрэва. Усё, што магла даць прырода, — тлумачыць мастацтвазнаўца.

Вялізныя аксесуары насілі багатыя давыд-гарадчанкі. Жанчыны надзявалі крыжы памерам з далонь, якія звісалі да пояса ці падтыкаліся, як у святароў. Полыя ўнутры крыжы выраблялія з латуні або серабра і аздабляліся стылізаванай выявай Хрыста.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

МОСКВА МИНСК БАНК

Открытое акционерное общество «Банк Москва-Минск»
220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ОКТЯБРЯ 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 01.10.2015 | 01.10.2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 632 069 | 359 688 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 799 879 | 542 780 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 413 529 | 287 827 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 158 733 | 99 194 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 5 625 298 | 4 100 359 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 172 | 172 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 322 749 | 289 790 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 574 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 64 114 | 26 157 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 8 017 117 | 5 705 967 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 229 153 | 23 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 2 076 401 | 1 847 040 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 4 868 908 | 3 002 073 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 2 360 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 42 843 | 99 042 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 7 217 305 | 4 950 538 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 75 680 | 75 680 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 36 182 | 23 048 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 228 412 | 209 396 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 459 538 | 447 305 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 799 812 | 755 429 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 8 017 117 | 5 705 967 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ОКТЯБРЯ 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 01.10.2015 | 01.10.2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 621 156 | 441 816 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 363 401 | 234 216 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 257 755 | 207 600 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 131 169 | 151 206 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 41 802 | 41 235 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 89 367 | 109 971 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 481 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 195 652 | 67 307 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (26 317) | (9 186) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 275 548 | 41 304 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 41 209 | 13 756 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 181 150 | 158 335 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 24 143 | 16 487 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 77 306 | 173 322 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 7 647 | 32 432 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 69 659 | 140 890 |

**Председатель Правления** **А.А. Раковец**

**Главный бухгалтер** **А.В. Дорожкин**

**Квартальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: http://www.mmbank.by/about/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 16, выдана Национальным банком Республики Беларусь 17.03.2015 года.
УНН 807000002

## Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (УНП 600025392):

**1) Здание КТП общей площадью 55 м², расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2. Начальная цена – 142 470 000 бел. руб. с учетом НДС 20%. Торги проводятся повторно. Информация об аукционе ранее публиковалась 01.09.2015 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%.**

**2) Здание конюшни общей площадью 1598,1 м², расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2. Начальная цена – 2 149 283 052 бел. руб. с учетом НДС 20%. Торги проводятся повторно. Информация об аукционе ранее публиковалась 01.09.2015 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%.**

**Торги в виде аукциона состоятся 26 октября 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10 (по месту нахождения организатора торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения предварительно согласовав дату и время с организатором торгов.**

Шаг аукциона – 5 процентов. Продавец – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88). Организатор торгов – ООО «Партнер-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 315-58-26).

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. *Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 1 процента от начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с №3012610007128 в филиале №612 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 810, УНП 600025392, получатель ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 30 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже движимого имущества ликвидируемого частного производственно-торгового унитарного предприятия «Альбус»

| Наименование лота | Начальная цена (с учетом НДС), руб. | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|
| Ювелирные изделия в ассортименте согласно перечню, размещенному на сайте www.azc.by | смотреть на сайте | смотреть на сайте | смотреть на сайте |

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Альбус»** |
| **Организатор торгов:** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж)** |
| **Время проведения торгов:** | **12.11.2015 в 14.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 06.11.2015** |
| **Порядок подачи заявок:** | **На почтовый адрес организатора торгов: 220050, г. Минск, а/я 85** |
| **Срок внесения задатка:** | **по 06.11.2015** |
| **Реквизиты для оплаты задатка:** | **ЧПТУП «Альбус», р/с 3012034245019 в ЦБУ №205 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, г. Браслав, УНП 390506973** |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• для участия в торгах организатору торгов представляются следующие документы:

- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе и их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь) копии учредительных документов представляются вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, а также доверенностью на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

- индивидуальным предпринимателем: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

Помимо указанных документов вышеперечисленными лицами представляется оригинал документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении;

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• победитель торгов оплачивает цену лота **с учетом НДС**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;

• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;

• в случае, если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8(017)2130699.**

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит вторые повторные ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже недвижимого имущества ликвидируемого частного производственно-торгового унитарного предприятия «Альбус»

| № лота | Наименование лота (предмета торгов) | Начальная цена лота (без НДС), руб. | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий (швейный цех), инв. № 210/С-11122, 1978 г.п., площадью 924,4 кв.м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Браслав, пер. Песчаный, д. 8 на арендуемом земельном участке с кадастр. № 220850100020000002 площадью 0,2281 Га. | 769 158 000 | 38 457 900 | 76 915 800 |

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Альбус»** |
| **Организатор торгов:** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж)** |
| **Время проведения торгов:** | **27.10.2015 в 14.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 23.10.2015** |
| **Порядок подачи заявок:** | **На почтовый адрес организатора торгов: 220050, г. Минск, а/я 85** |
| **Срок внесения задатка:** | **по 23.10.2015** |
| **Реквизиты для оплаты задатка:** | **ЧПТУП «Альбус», р/с 3012034245019 в ЦБУ №205 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, г. Браслав, УНП 390506973** |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• для участия в торгах организатору торгов представляются следующие документы:

- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе и их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь) копии учредительных документов представляются вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, а также доверенностью на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

- индивидуальным предпринимателем: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

Помимо указанных документов вышеперечисленными лицами представляется оригинал документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении;

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• победитель торгов оплачивает цену лота **с учетом НДС**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;

в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;

• в случае, если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов, а также ознакомиться с документацией по предмету торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8(017)2130699 либо по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж).**

■ Што чытаць?

# СВЕТ СУЧАСНАЙ КНІГІ




**Распачаўшы рэспубліканскую акцыю «Сямейнае чытанне» (заснавальнікі — Міністэрства інфармацыі, Беларускі саюз жанчын, Выдавецкі дом «Звязда»), яе арганізатары і актыўныя ўдзельнікі вырашылі адказаць на самае галоўнае пытанне: а што ж чытаць? Якім павінен быць выбар галоўнай ці проста цікавай і патрэбнай кнігі? І ў пошуку адказаў на гэтае пытанне «Звяздзе» дапамогуць выдаўцы, бібліятэкары, пісьменнікі, а часам і проста чытачы. Сённяшні суразмоўца — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэт і празаік Алесь БАДАК.**


Фота Наталлі АЛЯКСАНДРАВАЙ.

***— Завяршаецца чарговы год. Чым ён быў найбольш цікавы для «Мастацкай літаратуры»? Якая самая яркая кніга, на ваш погляд, характарызуе выдавецтва ў гэтым годзе?***

— Думаю, адказаць на гэтае пытанне не проста складана, а нават немагчыма. І не толькі таму, што выбіраць трэба з цэлай сотні найменняў. Але яшчэ і таму, што выдавецтва актыўна працуе ў розных кірунках. Мы выдаём і класіку, і сучасных аўтараў, мастацкую літаратуру і дакументальную, дарослую і дзіцячую. Але, безумоўна, у першым шэрагу кніг, выдадзеных у гэтым годзе, стаяць чарговыя тамы Збору твораў Уладзіміра Караткевіча (нядаўна з'явіўся дзясяты) і «Залатой калекцыі беларускай літаратуры», якая на днях папоўнілася томам Кузьмы Чорнага. Калі ж гаварыць пра сучасную літаратуру, то, як можа ні дзіўна камусьці падасца, я ў першую чаргу назваў бы кнігу «Мой дзень пачынаецца», якую склалі вершы і апавяданні 45 маладых аўтараў. Вось мы часта гаворым пра тое, што сённяшнім маладым куды лягчэй выдавацца, чым гэта было, скажам, у 70-я ці 80-я гады мінулага стагоддзя. Вядома, яно так і ёсць, але ва ўсе часы і ў літаратуры былі тыя, хто ўмеў неяк прапіхнуць сябе, выдацца і раз, і два, і тры, хоць і таленту асаблівага ў іх можа не было. І ва ўсе часы былі тыя, якія не ўмелі абіваць парогі выдавецтваў і рэдакцый, хоць, магчыма, якраз яны і вартыя самай пільнай увагі ці, прынамсі, большай падтрымкі з разлікам на тое, што з іх з часам могуць атрымацца вельмі цікавыя і арыгінальныя пісьменнікі. Тое ж адбываецца і сёння. Таму хацелася, каб у зборніку «Мой дзень пачынаецца» было прадстаўлена як мага больш аўтараў. Ну а пасля такая аўтарская шматлікасць дазваляе скласці найбольш цэласнае ўяўленне пра маладую літаратуру.

***— Алесь Мікалаевіч, а калі гаварыць пра асноўную плынь выдавецкай дзейнасці, асноўныя кірункі «Мастацкай літаратуры», то нечым яны адрозніваюцца апошнім часам?***

— Я хутчэй сказаў бы, што сёння мяняецца сам падыход да фарміравання выдавецкіх планаў. Мы вельмі ўважліва ставімся да таго, што патрэбна нашым бібліятэкам, што найбольш запатрабавана Саюздрукам. Зразумела, гэта ніякім чынам не разыходзіцца з нашай выдавецкай палітыкай, якая скіравана найперш на выданне якаснай мастацкай літаратуры. Такія пастаянныя кантакты, аналіз вельмі дапамагаюць нам у вызначэнні тыражу той ці іншай кнігі, нават у стварэнні новых серый. Напрыклад, мы задумалі ў наступным годзе пачаць дзве новыя серыі: «Бібліятэка выбраных твораў» і «ПазаКласнае чытанне» («К» з вялікай літары, бо мы спадзяёмся, што гэтыя творы падлеткі, якім яны і адрасаваны, сапраўды палічаць класнымі). Перад тым як распрацоўваць гэтыя серыі, мы, безумоўна, раіліся з бібліятэкамі.

***— Сёння шмат гавораць пра рэйтынгі... Вы на іх зважаеце? Якія кнігі «Мастацкай» у рэйтынгу найбольш чытэльных выданняў ці ў ліку найбольшых продажаў у кнігарнях?***

— Безумоўна, рэйтынгі — гэта заўсёды цікава, карысна, гэта тое, што нельга абыходзіць увагай. Але пры гэтым трэба не забываць, што рэйтынгі бываюць розныя. Правядзіце аднолькавае апытанне сярод філолагаў, гэта значыць, сярод тых, для каго мастацкая літаратура мае непасрэднае дачыненне да іх прафесіі, а значыць, і літаратуру яны ацэньваюць, не ў апошнюю чаргу, з пункту гледжання яе навізны, арыгінальнасці, і людзей, для якіх літаратура — гэта магчымасць «забіць» некалькі хвілін вольнага часу, напрыклад, у дарозе. Вынікі, хутчэй за ўсё, будуць вельмі адрознівацца. Не сакрэт жа, што для адпачынку трэба што-небудзь просценькае, што не вельмі напружвае: лёгкі дэтэктыў, лёгкая фантастыка, лёгкі любоўны раман — прычым творы, якія ствараюцца па адным клішэ, нібы пад капірку. А арыгінальная літаратура не церпіць паўтораў, копій.

З іншага боку, калі гаварыць пра розныя рэйтынгі, то няцяжка прыйсці да высновы, што сёння не самым вялікім попытам карыстаецца паэзія. Але мы не можам яе не выдаваць, паколькі гэта адзін з самых важных літаратурных жанраў, які, нават пры, здавалася б, невялікіх тыражах, вельмі ўздзейнічае, уплывае на наша духоўнае, культурнае жыццё.

А ўвогуле, вельмі радуе, што ў ліку самых папулярных у продажы па-ранейшаму творы гістарычнай літаратуры — гэта сведчыць пра тое, што беларусы неабыякавыя да сваёй гісторыі. Праўда, тут усё-ткі, як і некалі, самы папулярны аўтар — Уладзімір Караткевіч. Вельмі шмат званкоў — ці выйшаў чарговы том яго Збору твораў, дзе можна набыць... Мне здаецца, сучасным аўтарам трэба актыўней шукаць менавіта сваю нішу ў гістарычным жанры, а не ісці па слядах папярэднікаў.

***— Вельмі часта сёння ў друку гаворыцца пра прарыў дзіцячага кнігавыдання. Ды некалі «Мастацкая» далучыла да сябе такое аўтарытэтнае выдавецтва, як «Юнацтва»... Свет сучаснай дзіцячай кнігі, якім ён уяўляецца з вокнаў выдавецтва?***

— Мяне вельмі радуе, што гэты свет вельмі разнастайны. Сёння можна гаварыць і пра дзіцячую прыгодніцкую літаратуру, і пра дзіцячую фантастыку, і пра дзіцячы дэтэктыў, і нават пра дзіцячую інтэлектуальную літаратуру. Пачытайце кнігі Раісы Баравіковай, Георгія Марчука, Пятра Васючэнкі, каб у гэтым пераканацца. А ёсць жа і больш маладыя аўтары, якія па-свойму малююць гэты свет — напрыклад, тая ж Алена Мальчэўская.

***— Якога рукапісу вам як выдаўцу сёння нестае?***

— Напэўна, рукапісу, які меў бы вельмі вялікі чытацкі попыт, пра які ўсе гаварылі б, спрачаліся ў інтэрнэце, на старонках нашых літаратурных выданняў і які пры гэтым быў бы высокамастацкай літаратурай.

***— Такая важкая дзялянка, як пераклады чужых нацыянальных літаратур на беларускую мову... Работа над выданнем перакладной літаратуры заўсёды была ў полі зроку «Мастацкай». Выходзілі альманахі «Братэрства», «Даляглялы». Як складваюцца абставіны ў гэтых абсягах цяпер?***

— Калі перакладная дзіцячая літаратура ў нас выходзіць досыць рэгулярна, то перакладная дарослая, на жаль, ад выпадку да выпадку. На гэта ёсць свае прычыны: і тое, што не заўсёды проста вырашыць праблемы з аўтарскімі правамі, і тое, што папулярныя замежныя аўтары ў большасці сваёй ужо прысутнічаюць на нашым кніжным рынку на рускай мове. Але, я ўпэўнены, гэтая сітуацыя паступова будзе выпраўляцца, паколькі любы пераклад адметных твораў замежнай літаратуры толькі дапамагае далейшаму развіццю сваёй літаратуры. Якім бы ні быў насычаным кніжны рынак, месца на ім хопіць усім, проста трэба больш актыўна і самаадданa працаваць.

***— Значыць, трэба выбіраць «класнае чытанне»?..***

— А чаму б і не?!

***— І з яго павінен пачынацца дзень...***

— І завяршацца ў сям'і ў цёплай і ўтульнай атмасферы, калі кніга, чытанне яднаюць пакаленні, саграваюць думкамі, вобразамі, уражаннямі.

***— Нельга не пагадзіцца з вамі, Алесь Мікалаевіч.***

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**

***Як пасляслоўе.*** *А вы, шаноўныя чытачы, якіх кніг чакаеце ад айчынных выдавецтваў? Дзяліцеся з намі сваімі думкамі, выкладайце іх з разлікам, што вас пачуюць і яны могуць стаць падставай для новых творчых здзяйсненняў. Да новых сустрэч! Прыемнага чытання!*

■


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 240/С-28820, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – лесопильный цех, стоимостью 467 940 000 бел. рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧПТУП «Форест – М » (УНП 391080939) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Орша, ул. Белинского, 1а |
| **Информация об обременениях** | Залог ОАО «Белинвестбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 05.11.2015 года в 10.00 г. Орша, ул. Островского, 36, кабинет 10 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и города Орши 211030, ул. Островского, 36 Судебный исполнитель Фаустович Оксана Бектуровна. Тел. 80216543212. Начальник отдела Федоненкова Наталья Сергеевна, тел. 80216543213 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и города Орши № 3642903000794, УНН 300002505 Оршанского отделения АСБ «Беларусбанк», код 647, **не позднее 16.00 04.11.2015.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «Минский подшипниковый завод», г. Минск, ул. Жилуновича, 2** |

| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
|---|---|---|---|---|
| **Навес для сельхозтехники** | Сооружение специализированное сельскохозяйственного назначения | 599,6 кв.м | 600/С-141879 | Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Новое Поле |
| Составные части и принадлежности | Ограждение мехдвора с бетонированием площадки (в составе: ограждение железобетонное протяженностью 166 м; ограждение из проволочной сетки протяженностью 48 м; ограждение металлическое протяженностью 30 м; бетонная площадка, площадь 391 кв.м) | | | |

**Начальная цена с НДС 20% – 1 026 954 960 белорусских рублей.**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Предоставлен продавцу для обслуживания навеса сельхозтехники и ограждения мехдвора с бетонированием площадки на праве аренды земельный участок пл. **0,6050 га** (срок действия: по 05.07.2111) |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **17.11.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |


■ Водгукі

# ПОМНІК МІЛАСЭРНАСЦІ



**Прысуджэнне Святлане АЛЕКСІЕВІЧ Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры выклікала шырокі розгалас у свеце. Водгукі пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў розных краін змешчаны і на інтэрнэт-старонцы «Созвучие: литература и публицистика стран СНГ» (http://sozvuchie.zviazda.by).**

**Расійскі пісьменнік Дзмітрый БЫКАЎ** лічыць, што адзнака Святланы Алексіевіч «занадта прадказальны варыянт». Бо яна «лідзіравала ва ўсіх апытаннях яшчэ з мінулага года. І ў букмекерскіх канторах, наколькі я памятую, стаўкі былі 1 да 5. Гэта вельмі прадказальнае рашэнне. Яно, безумоўна выклікае гонар і адабрэнне».

**Празаік Амантай АХМЕТАЎ з Казахстана** выказаўся наступным чынам: «Для Святланы Алексіевіч фронт барацьбы за мірную будучыню свайго народа не завяршыўся адной кнігай. Яе багаты журналісцкі вопыт і дакладная пазіцыя непрыняцця зла дазволілі ёй раскрыць і іншы боль народа...»

**Камран НАЗІРЛІ, перакладчык і празаік з Азербайджана,** гаворыць пра вядомасць Святланы Алексіевіч у Азербайджане. «Ганаруся тым, што жыву, дыхаю і пішу ў адным стагоддзі з ёю», — зазначае Камран Назірлі, выказваючы гатоўнасць працаваць над перакладамі яе твораў на азербайджанскую мову.

**Літаратуразнаўца з Калмыкіі Рыма ХАНІНАВА** нагадвае: «Калі помніць, што многія сённяшнія пісьменнікі выйшлі з СССР, як і новы нобелеўскі лаўрэат, то Святлана Алексіевіч — шосты лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў той літаратуры, якая стваралася і ствараецца на рускай мове». Відаць, з такой логікай складана пагадзіцца, угледзеўшыся ў жыццёвыя біяграфіі ўсіх папярэднікаў Святланы Аляксандраўны — Івана Буніна, Барыса Пастэрнака, Міхаіла Шолахава, Аляксандра Салжаніцына, Іосіфа Бродскага. І далей Р. Ханінава заўважае: «Шматгалосая творчасць пісьменніцы — сапраўды помнік міласэрнасці і мужнасці нашых народаў, якія прайшлі суровыя выпрабаванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сталінскіх рэпрэсій, але не страцілі веру ў дабро і справядлівасць ісціны».

Сваё слова на старонцы «Созвучие» пра Святлану Алексіевіч сказалі і пісьменнікі, літаратуразнаўцы Георгій Прахін, Алесь Кажадуб (Масква), Атнер Хузангай (Чабаксары), Лула Куні (Грозны), Леанід Чыгрын (Таджыкістан, Душанбэ), Севіндж Нурукызы (Азербайджан), Агагельды Аланазараў (Туркменістан), Святлана Ананьева (Казахстан), Міхайла Слабашпіцкі, Галіна Тарасюк (Украіна) і шмат хто яшчэ.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ**

■

■ Незвычайнае — побач

# ЗАГАДКА «КОРКАВАГА» ГАЮ

## Як аксаміт амурскі «прапісаўся» на Шчучыншчыне

**Працуючы над краязнаўчым праектам «7 цудаў Шчучыншчыны», у мясцовай гімназіі палічылі галоўнымі славутасцямі роднай зямлі палац князёў Друцкіх-Любецкіх, Ракавіцкі цудатворны абраз Божай Маці, Маламажэйкаўскую царкву-крэпасць XVI стагоддзя, вітражы касцёла святых апосталаў Пятра і Паўла ў Старых Васілішках, калегіум піяраў, батанічны сад Станіслава Баніфацыя Юндзіла. А таксама, мабыць, адзіную ў Беларусі плантацыю коркавага дрэва (аксаміта амурскага), якая знаходзіцца непадалёк ад райцэнтра. Цікава, як гэты экзатычны для нас від трапіў на Шчучыншчыну?**

### Даведка

*Аксаміт амурскі расце пераважна на Далёкім Усходзе, у лясах Маньчжурыі, Хабараўскага края, Прыамур'я і Прымор'я, у Кітаі, Карэі, на Тайвані, Сахаліне, Курыльскіх астравах і ў Японіі. Адносіцца да рэліктавых відаў, што раслі да абледзянення — гэта жывыя помнікі прыроды. З кары вырабляюць тэхнічны корак, з драўніны — мэблю. Добры меданос, адварам кары карыстаюцца ў тыбецкай народнай медыцыне для лячэння алергіі, поліартрытаў, захворванняў нырак, вачэй і іншых, а ў карэйскай медыцыне свежыя ягады аксаміта амурскага прымяняюць пры цукровым дыябеце. Прэпараты з гэтага дрэва выкарыстоўваюцца ў якасці танізуючых, антысептычных, гарачкапаніжальных і кроваспыняльных сродкаў.*

Ролю гіда падчас экскурсіі (а гэты гай сапраўды можа стаць адным з турыстычных аб'ектаў) выконвае ляснічы Шчучынскага лясніцтва Дзмітрый Жлаба. Праязджаем кіламетраў дзесяць ад былога ваеннага аэрадрома — і вось яна, дзівосная для беларускіх шырот плантацыя! Праўда, даканала не ведаючы лясныя пароды, адразу і не адрозніш коркавыя дрэвы, напрыклад, ад ясеня — лісце вельмі падобнае. А вось кару, якае мае папяліста-шэры дэкаратыўны выгляд, з іншай не пераблытаеш. Кажуць, што яна ў любую пару года захоўвае сваю цеплыню, нават у моцныя маразы. Снег, накрыўшы галіны, амаль адразу ж растае. А галоўная адметнасць у тым, што дрэва з цягам часу перыядычна скідвае, быццам лісце, верхні слой кары. Ён сам адыходзіць ад ствала, а на змену вырастае новы.



Ляснічы Шчучынскага лясніцтва Дзмітрый ЖЛАБА: «Да «коркавага» гаю ставімся клапатліва».

— Не магу сказаць, дзе бралі насенне для гэтай плантацыі і калі дакладна яна закладвалася. Нават у нашага старэйшага лясніка цікавіўся — не ведае, бо садзілася не пры ім. Але пераважае версія, што гэта зрабілі ў 1954 годзе для патрэб Лідскага піўзавода, — паведаміў Дзмітрый Жлаба.

У той час з кары аксаміта амурскага выраблялі пракладкі для бляшанак шкляной тары. Верагодна, каб не завозіць гэты матэрыял з Далёкага Усходу, паспрабавалі атрымліваць сыравіну на месцы. Дарэчы, улічылі і пытанне аховы плантацыі, размясціўшы яе на тэрыторыі непадалёк ад ваеннага аэрадрома. Яна за савецкім часам лічылася рэжымнай і не мела вольнага доступу. Аднак пакуль «коркавы» гай вырас, з'явіліся новыя тэхналогіі для закаркоўвання бутэлек, і цяпер гэта ўжо хутчэй краязнаўчая «фішка»: вось што ў Беларусі можа паспяхова расці! Хаця, пэўна, існуюць і нейкія варыянты прамысловага выкарыстання гэтых дрэў: калі не для коркаў, то, можа, для вырабу нейкіх сувеніраў? Мажліва, тут ёсць магчымасці для малога і сярэдняга бізнесу — зразумела, пры ўмове выканання прыродаахоўных патрабаванняў. Калі будуць адпаведныя прапановы, то мясцовая ўлада іх разгледзіць, у тым ліку і з прадастаўленнем памяшканняў, што засталіся ад былога ваеннага аб'екта.



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

«Коркавы» гай (па суседстве з аксамітам амурскім таксама растуць сасна, дуб і некаторыя іншыя дрэвы) займае плошчу 1,2 гектара. Дзмітрый Жлаба кажа, што ён заўсёды лічыўся ў лясніцтве асобным масівам, да якога ставяцца клапатліва:

— Стараемся сюды не лезці са сваімі высечкамі догляду (хіба што прыбярэм паваленае дрэва), каб гэты гай заставаўся, так бы мовіць, у некранутым выглядзе.

Дарэчы, гэтая плантацыя яшчэ даволі маладая, бо тэрмін жыцця аксаміта амурскага складае каля трохсот гадоў.

### Дарэчы

*Шчучыншчына мае даўнія раслінаводчыя традыцыі, пра што сведчыць стварэнне тут у XVIII стагоддзі манахам каталіцкага ордэна піяраў, выдатным вучоным Станіславам Баніфацыем Юндзілам батанічнага саду. Час яго не пашкадаваў, але і сёння ў райцэнтры і наваколлі захавалася нямала рэдкіх і нават экзатычных дрэў. Сярод іх шаўкоўніца, сасна Веймутава, арэх маньчжурскі, ліпа буйналістая, лістоўніца еўрапейская, кедр сібірскі і іншыя.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК**
*prakopchik@zviazda.by*
*Шчучынскі раён*

■ Выбірай сваю прафесію

# КРЫЛЫ МАЙСТРОЎ

Днямі, калі адзначалі 75-годдзе сістэмы прафтэхадукацыі ў Беларусі, увагу мінчан і гасцей сталіцы прыцягвала выстава-кірмаш, размешчаная каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Колькі там было паказана дзівосаў — твораў маладых майстроў разьбы па дрэве, саломапляцення, мастацкага роспісу, керамікі, інкрустацыі!.. Расказвалася тут, і як атрымліваюць рабочую прафесію будучыя муляры, тынкоўшчыкі, сталяры, цесляры.

А ў каго пераймаюць гэта майстэрства навучэнцы? З такім пытаннем я звярнуўся да Ганны Бойкі, дырэктара прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі. У адказ пачуў расповед пра калектыў выдатных вопытных настаўнікаў. Пад іх кіраўніцтвам у майстэрнях і вучэбных кабінетах учарашнія школьнікі атрымліваюць глыбокія тэарэтычныя і практычныя веды. У каледж паступае моладзь з няпоўнай і поўнай сярэдняй адукацыяй, таму і вучэбны курс тут разлічаны на тэрмін ад аднаго да трох гадоў. Каб засвоіць тэхніку інкрустацыі міліметровымі кавалачкамі саломкі ці кладку важкіх цаглін у сцяну будынка, патрэбны спецыяльныя вучэбныя месцы. Так, на адпаведных стэндах адточваюць сваё майстэрства будучыя тынкоўшчыкі, муляры. Для керамістаў адведзена прасторная майстэрня, такія ж умовы створаны для мастакоў роспісу па дрэве, цесляроў.

Па словах кіраўніка навучальнай установы, клапоцяцца тут не толькі пра прафесійную адукацыю моладзі, але і пра яе далейшае працаўладкаванне. Так, напрыклад, сёлета каледж заключыў дагавор з ЖРЭА Савецкага раёна Мінска, згодна з якім навучальная ўстанова дасць адпаведную прафесійную адукацыю групе навучэнцаў. У час вучобы моладзь будзе мець магчымасць праходзіць практыку побач са спецыялістамі, а пасля выпуску атрымае гарантаваныя працоўныя месцы ў камунальных установах гэтага раёна.

І яшчэ адзін яскравы факт да расказу пра сённяшні дзень найстарэйшага сталічнага каледжа: побач з вучэбным корпусам адкрыўся вучэбны салон-магазін «Прафмайстар», дзе можна набыць мастацкія творы, зробленыя ў вучэбных майстэрнях. Прыбыткі ад гэтага новаўвядзення яшчэ належыць падлічыць эканамістам, а для пакупнікоў — выгада відавочная. Сёння тут можна танна набыць арыгінальныя творы маладых майстроў — магчыма будучых вядомых мастакоў, дызайнераў.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

***На здымках:*** ***1.*** *Настаўніца, член Саюза майстроў Беларусі Алена ГУРЭЦКАЯ, са сваімі вучнямі;* ***2.*** *Майстар вытворчага навучання Вольга ДЗІНГІЛЕВІЧ і навучэнец Мікіта АЦІЦКІ ў майстэрні, дзе займаюцца будучыя муляры і тынкоўшчыкі;* ***3.*** *Настасся ГРЫШЧАНКА паспяхова авалодвае прафесіяй мастака-настаўніка*

1



2



3





## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1.** Аппарат для стыковой сварки труб «Ровелд Р250А2», инв. №09157, начальная стоимость лота 38 478 268 рублей. **Лот №2.** Трактор «Беларус МТЗ 82.1», рег. знак 3030ВА, 2004 года выпуска, инв. №08107, начальная стоимость лота 15 361 705 рублей. **Лот №3.** Автомобиль «Volkswagen Transporter», рег. знак 6148 ВМ-2, 1999 года выпуска, инв. №09155, начальная стоимость лота 40 949 977 рублей. **Лот №4.** Дистанционный лазерный измеритель, инв. №09226, начальная стоимость лота 3 127 375 рублей. **Лот №5.** Автомобиль «Ауди А6», рег. знак 5772 АР-2, 2002 года выпуска, инв. №09047, начальная стоимость лота 22 408 700 рублей. **Лот №6.** Полуприцеп «ОДАЗ», рег. знак А5120А-2, 1987 года выпуска, инв. №09232, начальная стоимость лота 20 430 632 рубля. **Лот №7.** Мойка высокого давления «Vrand», инв. №09121, начальная стоимость лота 12 868 555 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | КУП «Волынецкое ПМС» (Верхнедвинский р-н, д. Волынцы, УНП 300433113) |
| **Местонахождение имущества** | Верхнедвинский р-н, д. Волынцы. |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «БПС-Сбербанк». |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 323 23 октября 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323 Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома №3642903001037 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 16.00 22 октября 2015 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

Утерянную квитанцию о приеме денежных средств, серия КС №8735709 ЗАСО «Белнефтестрах», **считать недействительной.**

Утерянные свидетельство о государственной регистрации и печать ЧУП «АпиксГрупп» (УНП 190918540) **считать недействительными.**

# ІНТРЫГА «ЖОЎТАГА Д'ЯБЛА»

## «Ралі» на рынку золата будуць працягвацца?

**Напрыканцы мінулага тыдня цэны на золата пайшлі ўгору. У Лондоне тройская унцыя (31,1034768 грама) каштавала 1151,55 долара, за дзень «пацяжэўшы» на $11,55. Снежаньскі ф'ючарс на Нью-Ёркскай біржы Comex падаражэў на 13,2 долара, ці на 1,15% — да $1157,5 за тройскую унцыю. Гэтаму спрыялі апублікаваныя пратаколы верасьнёўскага пасяджэння Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША, дзе паведамлялася, што працэнтная стаўка павышацца не будзе. Прынамсі, пакуль. Сярод прычын такога рашэння называецца няпэўнасць стану сусветнай эканомікі.**
**Між тым у ліпені здарыўся адваротны «кульбіт», калі цэны на золата абваліліся да пяцігадовага мінімуму. Зноў-такі на фоне чакання, што ФРС хутка павялічыць працэнтныя стаўкі. Нягледзячы на такія зрухі, «жоўты д'ябал» застаецца адным з найбольш прывабных сусветных актываў. Але што з ім будзе адбывацца надалей?**

### АКТЫЎ ДАЎЖЫНЁЙ У 5 ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ

Людзі здабываюць золата спрадвеку. З гэтым металам чалавецтва сутыкнулася ўжо ў V тысячагоддзі да н.э., у эпоху неаліту, дзякуючы яго шырокаму распаўсюджанню ў выглядзе самародкаў.

**Пакуль на рынку дамінуе трэнд на зніжэнне цаны золата. Гэта можа працягвацца пэўны час, а кошт абваліцца ніжэй $1000 за унцыю. Але ў той жа час можна рыхтавацца да таго, што пачнецца такі ж актыўны рост, і тады цэннік будзе вышэйшым за $2 тыс. Як заўважаюць спецыялісты, золата па меры паглыблення крызісу сусветнай фінансавай сістэмы паступова будзе вяртаць свае пазіцыі ў міжнародных разліках.**

Археолагі мяркуюць, што пачатак сістэмнай здабычы быў пакладзены на Блізкім Усходзе, адкуль залатыя ўпрыгожанні пастаўляліся, у прыватнасці, у Егіпет. Менавіта ў Егіпце ў магільні каралевы Зэр і адной з каралеў Пу-абі Ур шумерскай цывілізацыі былі знойдзены першыя залатыя ўпрыгожанні, датаваныя III тыс. да н.э. Такім чынам, самаму «старому» актыву чалавецтва не менш за 5 тысячагоддзяў.

Прыблізна з канца VII стагоддзя да н.э. у Малой Азіі пачалі выкарыстоўвацца круглыя зліткі каштоўных металаў, іх стандарты гарантаваліся дзяржаўнай чаканкай. Такім чынам, манеты сталі ўніверсальным інструментам абмену для большасці цывілізацый Старога Свету. Залатыя манеты валодалі ўласнай каштоўнасцю, менавіта таму іх можна было выкарыстаць у якасці аплаты на ўсіх краінах свету, дзе ў прымяненні былі металічныя грошы. Аднак кожная краіна імкнулася чаканіць уласныя манеты, тым самым дэманструючы сваю незалежнасць.

Ужо пад канец XVII стагоддзя асноўным цэнтрам гандлю металамі стаў Лондан. Апроч таго, горад на Тэмзе — месца з'яўлення афіцыйнай цаны на золата. У 1696 годзе Банк Англіі першым у свеце нефармальна ўвёў адпаведны стандарт. На пачатку XVIII стагоддзя Лондан трывала набыў статус міжнароднага цэнтра па гандлі золатам. У 1717 годзе Ісак Ньютан вызначыў кошт на гэты каштоўны метал — 4,24 фунта стэрлінгаў за адну тройскую унцыю. Гэты «цэннік» быў нязменным цягам двух стагоддзяў.

Да канца XIX ст. залаты стандарт афіцыйна ўвялі ўжо некалькі краін, пасля чаго Лондан страціў ролю сусветнага цэнтра гандлю золатам. Банк Англіі паставіў сабе за мэту вярнуць адпаведнае прызначэнне. У 1919 годзе Банкам Англіі было падпісана пагадненне з сям'ю золатаздабыўнымі кампаніямі з Паўднёвай Афрыкі на пастаўку золата ў Лондан. У адпаведнасці з дагаворам яны павінны былі рэалізоўваць усё праз банкаўскі дом Ротшыльда. Пры гэтым кошт золата вызначалі пяць банкаў — удзельнікаў рынку. Адсюль бярэ свой адлік Лонданскі фіксінг.

На сучасным рынку золата, якім гандлююць на некалькіх біржах, кошт вызначаецца кожны дзень. Пры гэтым Лонданскі фіксінг уяўляе сабою эталон кошту ва ўсім свеце. Сёння фіксінг на золата вызначаюць наступныя банкі: Deutsche Bank, Societe Generale, HSBC, Scotia Mocatta, а таксама Barclays Capital. Старшынства перадаецца штогод ад адной фінансавай установы да іншай. Фіксінг на золата вызначаецца ў трох валютах за адну тройскую унцыю: доларах ЗША, фунтах стэрлінгаў і еўра. Паколькі долары ўяўляюць сабою сусветную рэзервовую валюту, то часта цана на золата вызначаецца менавіта ў іх.

### АКІЯНСКАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Паспрабуем «узважыць» сусветную «залатую скарбонку». Як сцвярджаюць спецыялісты, сярэдняя колькасць золата ў зямной кары складае менш за адну мільённую долю працэнта ад яе масы. Пры наяўнасці каштоўнага металу №1 у пародзе ад 0,5 г/т ужо разглядаюцца магчымасці яго прамысловай здабычы. Праўда, тут ёсць яшчэ адзін рэзерв, пра які варта ўзгадаць. Справа ў тым, што ў Сусветным акіяне канцэнтрацыя золата складае 4-10 мг на 1 тону вады, што перавышае 10 млрд тон. Даследаванні паказваюць, што золата ў донных асадках акіянаў месцамі перавышае сярэднюю канцэнтрацыю і яны ўяўляюць у перспектыве вялікую цікавасць.

Аднак, нягледзячы на шматлікія спробы, дагэтуль не распрацавана эканамічна выгаднага спосабу яго здабычы.

Запасаў золата хопіць свету максімум на 20 гадоў. Такі прагноз даюць аналітыкі Goldman Sachs, якія тлумачаць, што ў зямной кары зусім малая канцэнтрацыя каштоўных металаў, а ўзровень распрацоўкі новых радовішчаў не з лепшых. Праўда, перспектыўныя пункты з'яўляюцца рэгулярна. Напрыклад, нядаўна геафізікі выявілі ў падземных вадаёмах вострава Паўночны, што ў Новай Зеландыі, буйныя запасы золата і серабра. Усяго ў раёне вулканічнай зоны Тупа знойдзена шэсць радовішчаў каштоўных металаў. Па ацэнках навукоўцаў, золата тут больш як 20 тысяч частак на мільярд, а серабра — больш як 2 тысячы.

Гэта дазваляе ў выпадку арганізацыі здабычы каштоўных металаў атрымліваць да трох мільярдаў долараў у год ад вымання золата і $3,5 млрд — ад серабра. Асабліва рэнтабельнай можа быць здабыча металаў на дзвюх пляцоўках — Ратакава і Мокаі. Праўда, адзначаюць навукоўцы, для асваення перспектыўных радовішчаў патрэбна распрацоўка тэхналогіі бяспечнага вымання карысных выкапняў. Справа ў тым, што ў раёне вулканічнай зоны Тупа знаходзіцца аднайменнае кратарнае возера — адно з найбуйнейшых прэсных азёр рэгіёна і папулярнае месца адпачынку новазеландцаў і шматлікіх турыстаў.


Банкі розных краін павялічылі аб'ём закупаў золата.

### ТРЭНД НА ЗБЕРАЖЭННЕ

Сёння золата здабываецца ў 60—70 краінах свету. Бягучы сярэднесусветны сабекошт здабычы складае парадку $1 200 за тройскую унцыю пры норме вымання 0,5-2 грамы золата з 1 тоны горнай пароды радовішча (у залежнасці ад тыпу радовішча і ўжыванай тэхналогіі здабычы) і ўвесь час павялічваецца па меры выпрацоўвання багацейшых радовішчаў. Паводле звестак Сусветнай залатой рады (World Gold Council), летась аб'ём здабычы золата на радовішчах вырас на 2% і склаў 3114,7 тоны. Пры гэтым агульная вытворчасць золата (з улікам вернутага ў зварот лому ювелірных вырабаў, электронікі і рознага абсталявання) склала 4278,2 тоны, што менш як на 5 тон перавысіла вынік 2013 года.

Летась расійскія золатаздабыўныя кампаніі вырабілі 288 тон каштоўнага металу (рост на 9 працэнтаў у параўнанні з 2013-м) і выйшлі на другое месца ў свеце. Як заўважыў старшыня расійскага Саюза золатапрамыслоўцаў Сяргей Кашуба, расійская золатаздабыўная галіна апошнія пяць-сем гадоў знаходзіцца на ўздыме. Першае месца па здабычы золата займае Кітай, тройку лідараў замыкае Аўстралія.

Цікавы апошні трэнд — попыт на золата з боку ювеліраў і прамысловасці зменшыўся, затое цэнтральныя банкі розных краін павялічылі аб'ём закупаў золата амаль на 70 тон. Увогуле аб'ёмы сусветных запасаў золата перавысілі 180 тысяч тон. Паводле звестак Сусветнай залатой рады, больш за ўсіх назапасілі каштоўнага металу ЗША — 8 тыс. 133 тоны. На другім месцы цяпер Германія — 3 тысячы 381 тона, на трэцім — Міжнародны валютны фонд — 2 тыс. 814 тон. У Італіі 2 тыс. 435 тон, Францыі — 2 тыс. 435, Расіі — 1 тыс. 168, Кітая — 1 тыс. 54, Швейцарыі — 1 тыс. 40 тон.



Лонданскі фіксінг штодня вызначае эталон кошту.

### ЧАС ТРЫУМФУ

Фінансавы крызіс 2008 года і яго наступствы адрадзілі цікавасць да такой прылады грашова-крэдытнай палітыкі, як золата. Гэтая тэндэнцыя, расказвае Wall Street Journal, асабліва ярка выяўлена ў Еўропе, дзе цэнтральныя банкі сутыкаюцца з ціскам грамадскасці, якая заклікае набыць больш золата ці вярнуць у краіну тое, якое знаходзіцца ў сховішчах за мяжой. Напрыклад, Швейцарскі нацыянальны банк вымушаны больш як удвая павялічыць свае актывы ў золаце. Памятная і гісторыя з немецкім ЦБ, які вырашыў вярнуць у краіну свае 300 тон золата да 2020 года са сховішчаў ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. Такой жа палітыкі прытрымліваецца і Нідэрландскі цэнтральны банк, які паведаміў, што пераправіў 122,5 тоны золата коштам каля 4 млрд еўра са сховішча ў Нью-Ёрку ў сваю штаб-кватэру ў Амстэрдаме. Пры гэтым у ЦБ Галандыі патлумачылі сваё рашэнне тым, што гэты крок з'яўляецца «дадаткам да больш збалансаванага размеркавання рэзерваў, а таксама можа спрыяць умацаванню даверу грамадскасці».

Практыка ж паказвае, што цэнтрабанкі ўсё больш пільна прыглядаюцца да гэтага актыву. У кулуарах гучаць думкі пра зварот да так званага залатога стандарту. У ЗША тым часам з даўніх часоў склалася субкультура «залатых жукоў» (gold bugs), якія ўсім іншым інвестыцыйным прыладам аддаюць перавагу золату. Гэта сотні тысяч, калі не мільёны, грамадзян, многія з прыбыткамі значна вышэйшымі за сярэднія. Вельмі скептычна ставяцца да перспектыў амерыканскай, ды ўвогуле сусветнай эканомікі (і тут глабальны фінансавы крызіс — моцны аргумент), «залатыя жукі» ў якасці цвёрдай валюты прызнаюць толькі каштоўны метал. Развіццё інтэрнэту, а такім чынам, магчымасцяў прапагандаваць свой пункт погляду, павялічыла лік іх аднадумцаў у разы.

На думку вядомага эксперта Дэніса Гартмана, якога таксама называюць «сыравінным каралём», «ралі» на рынку золата, магчыма, толькі пачынаецца. Вядома, гэта не ўпершыню. Памятаеце, 2 красавіка 2001 года цэны на золата зваліліся да $255,3 за тройскую унцыю — самы нізкі паказчык. Кажучы пра перспектывы, многія не ўлічваюць шэраг фактаў пра «жоўтага д'ябла». Пасля дасягнення мінімуму ў 2001-м золата даражэла 12 гадоў запар, і такі дынамікі не назіралася больш ні па адным актыве на фінансавым рынку. Потым, вядома, каштоўны метал пачаў таннець. На думку эксперта, пасля гэтулькіх гадоў бесперапыннага росту любы актыў перажыў бы карэкцыю. Пакуль на рынку дамінуе трэнд на зніжэнне цаны золата. Гэта можа працягвацца пэўны час, а кошт абваліцца ніжэй за $1000 за унцыю. Але ў той жа час можна рыхтавацца да таго, што пачнецца такі ж актыўны рост, і тады цэннік будзе вышэйшым за $2 тыс. Як заўважаюць спецыялісты, золата па меры паглыблення крызісу сусветнай фінансавай сістэмы паступова будзе вяртаць свае пазіцыі ў міжнародных разліках — менавіта таму шэраг цэнтрабанкаў мэтанакіравана скупляюць золата. Але сапраўдны трыумф каштоўнага металу, мяркуюць эксперты, наступіць бліжэй да 2025-2030 гадоў. Ці варта губляць давер да актыву, які паспяхова выкарыстоўваецца ўжо на працягу 5 тысяч гадоў?

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*litvinov@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже доли в уставном фонде Белорусско-германского производственного совместного предприятия «Минский Мебельный Центр» общество с ограниченной ответственностью, принадлежащей ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций»**

| | | Начальная цена продажи доли без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Доля ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций» в уставном фонде Белорусско-германского производственного совместного предприятия «Минский Мебельный Центр» общество с ограниченной ответственностью (далее – СП «ММЦ» ООО) – 32,5%. Местонахождение общества – СП «ММЦ» ООО; 222310 Республика Беларусь, Минская область, город Молодечно, улица Великий Гостинец, 31 А, корпус 3. Размер уставного фонда – 2 176 000 долларов США. | 48 204 328 169 | 9 640 865 634 | 5 |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов)– Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты, приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,4% (ноль целых четыре десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 16.11.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
Задаток на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже доли ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций» в уставном фонде СП «ММЦ» ООО, **проводимом 16 ноября 2015 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений **13.11.2015 в 12.00.**

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 23 октября 2015 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20% после первых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Ратон» на праве собственности

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч.НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание корпуса №23, **инв. №350/С-136647** | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 19/23 | Назначение: здание обрабатывающей промышленности иного назначения. Двухэтажное кирпичное строение, 1979 года постройки. Общая площадь 1133,1 м.кв. Составные части и принадлежности: подвал, два схода в подвал. | 2 526 720 000 | 50 000 000 |
| | **Земельный участок** для эксплуатации и обслуживания здания площадью **0,5827 га** с кадастровым номером 340100000002005111 на праве аренды сроком по 31.12.2017 г. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. | | | | |
| 2 | Здание корпуса №24, **инв. №350/С-159775** | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 19/24 | Назначение: здание обрабатывающей промышленности иного назначения. Двухэтажное кирпичное строение, 1978 года постройки. Общая площадь 2319,0 м.кв. Составные части и принадлежности: мет. лестница, два бункера, склад, навес, вентиляторная с камерой сушки, площадка для складирования и сушки пиломатериалов, бетонное мощение. | 5 642 880 000 | 50 000 000 |
| | **Земельный участок** для эксплуатации и обслуживания здания площадью **0,6595 га** с кадастровым номером 340100000002005446 на праве аренды сроком по 31.12.2017 г. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. | | | | |
| 3 | Административно-производственное здание, **инв. №350/С-4686** | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Карбышева, 9 | Назначение: здание административно-хозяйственное. Четырехэтажное кирпичное строение, 1990 года постройки. Общая площадь 5702,5 м.кв. Составные части и принадлежности: три пристройки, подвал, крыльцо, сход в подвал, машинное отделение, три склада, два навеса, забор, трое ворот, два тротуара, проезжая часть, бордюры тротуарные, бордюры проезжей части. **Части здания общей площадью 1779,01 м.кв. сданы в аренду максимальным сроком по 30.09.2018 г.** | 16 339 200 000 | 100 000 000 |
| | **Земельный участок** для эксплуатации и обслуживания здания площадью 1,4615 га с кадастровым номером 340100000006000205 на праве постоянного пользования. Земельный участок для организации проезда общего пользования площадью 0,0312 га с кадастровым номером 340100000006005005. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. | | | | |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 22 октября 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **23 октября 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты.

**При подаче заявления участник должен иметь**:

1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе;

2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №___** согласно извещению в газете «Звязда» от 13 октября 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона от окончательной цены продажи Объектов в размере: по лоту №1 – 2%, по лоту №2 – 1%, по лоту №3 – 0,5%; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данным лотам было опубликовано в газете «Звязда» №171 от 08.09.2015 г.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by •e-mail: info@gino.by**

**Продавец: ОАО «Ратон», г. Гомель, ул. Федюнинского, 19. ☎ 8 (029) 654-10-63; 8 (029) 366-82-16.**

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 4 ноября 2015 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями № 15-У-15 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске на девяти земельных участках, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Айвазовского | 0,8470 | жилая многоквартирная застройка (повышенной комфортности) | 2 772 982 575 | 550 000 000 | 131 892 835 | отселение и снос жилых и нежилых строений по проезду Энергетическому, 1, 3, 4, 5, 7, 9, 11, по ул. Айвазовского, 3, 5, 7, 9, 11, 13 | 28 413 563 200, а также затраты по отселению жильцов с 68,86 кв. м государственного жилищного фонда |
| 2 | г. Минск, ул. Широкая | 0,6630 | многоквартирный жилой дом (повышенной комфортности) со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения | 2 215 413 145 | 440 000 000 | 144 114 321 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Широкая, 2, 4 корп. 2, 6,10 | 34 270 687 200, а также затраты по отселению жильцов с 104,70 кв. м государственного жилищного фонда |
| 3 | г. Минск, ул. Нестерова – МКАД (6 км) | 1,5401 | многофункциональный комплекс автосервиса с паркингом | 4 079 368 590 | 810 000 000 | 83 124 166 | снос не зарегистрированных в установленном порядке объектов недвижимого имущества (автомобильная парковка, строение неустановленного назначения, по ул. Нестерова, здание склада, производственно-складской базы с административными помещениями по ул. Илимской) | в денежном выражении отсутствует |
| 4 | г. Минск в границах, ул. Одесская – ул. Лазо – ул. Ушакова | 2,6637 | многоквартирные жилые дома повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения | 5 572 652 910 | 1 110 000 000 | 222 861 877 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Автозаводской, 8, 10, 12, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 22, 23, 24, 25, 26, 28, 30, 32, 38, 40, 42, 44, 46, по ул. Лазо, 42, 44, 46, 48, 50 | 34 404 255 720 руб., а также затраты по отселению жильцов с 320,85 кв.м государственного жилищного фонда |
| 5 | г. Минск, ул. Брестская | 1,2143 | объект административно-производственного назначения с автосервисом | 3 322 517 680 | 660 000 000 | 69 219 925 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Брестской, 8, 10, 12, 12А, 14, 16 | 15 137 100 000 руб., а также возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 72 114 970 руб.* |
| 6 | г. Минск, ул. Р. Люксембург | 0,6600 | многоквартирная жилая застройка повышенной комфортности | 1 659 675 820 | 330 000 000 | 156 877 626 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Р. Люксембург, 152, 156, 158, ул. Карпова, 6 | 28 946 735 000 руб., а также затраты по отселению жильцов с 195,18 кв.м государственного жилищного фонда |
| 7 | г. Минск на пересечении ул. Кольцова и 1-го пер. Кольцова | 0,4028 | многофункциональный общественный центр | 916 030 500 | 180 000 000 | 63 817 010 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Кольцова, 40/13, 42, 46, по 1-му пер. Кольцова, 15 | 5 224 640 000 руб. |
| 8 | г. Минск на пересечении ул. Я Мавра – ул. Пономаренко | 3,2300 | многоэтажный жилой комплекс повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения и паркингом | 7 023 005 440 | 1 400 000 000 | 226 493 719 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Пономаренко, 14, 16, 18, 20, 22, по ул. Я.Мавра, 64а, 68а, 68б, 68в, 68г, 70 | 84 203 823 600 руб., а также затраты по отселению жильцов с 2 028,25 кв.м государственного жилищного фонда |
| 9 | г. Минск, ул. Калинина | 0,1288 | административный общественный комплекс с подземным паркингом | 373 799 770 | 74 000 000 | 77 165 396 | снос и отселение жилого дома по ул. Калинина, д. 12 | 10 430 482 680 руб., а также затраты по отселению жильцов с 55,6 кв.м государственного жилищного фонда |

** Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения, и соответствующего уровня инфляции.*

Основные условия проектирования и строительства объектов указаны в актах выбора места размещения земельных участков и прилагаемой к ним документации.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанном земельном участке и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Аукцион состоится 4 ноября 2015 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 29 октября 2015 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляется:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. № 6, с 14 октября 2015 г. по 29 октября 2015 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона* в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

** – единственный участник несостоявшегося аукциона – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.*

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. **По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.**

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельному участку (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

■ Спорт-тайм

# НЕ ЛЕПШЫ ТЫДЗЕНЬ

**Гандбалісткі нашай зборнай церпяць другое паражэнне запар на адборачным турніры чэмпіянату Еўропы, валейбалісты завяршылі выступленне на групавым этапе кантынентальнага першынства, а беларускі баксёр стаў чэмпіёнам свету — актуальныя навіны спорту ў штотыднёвым аглядзе «Звязды».**

***1. Хакейнае мінскае «Дынама» адправілася на выезд без пяці асноўных форвардаў.*** У спісе траўмаваных знаходзяцца: Шарль Лінгле, Аляксандр Кулакоў, Мэт Элісан, Раян Вескі, Артур Гаўрус і абаронца Алег Гарошка. У першай выязной гульні, дзе мінскія «зубры» саступілі ЦСКА 1:2, траўму атрымаў і лідар каманды — Джонатан Чычу.

Сёння нашы хакеісты згуляюць з ніжагародскім «Тарпеда», пасля чаго на пару дзён вернуцца ў Мінск, а затым каманду чакае чатырохматчавае далёкаўсходняе турнэ.

***2. Гандбалісткі зборнай Беларусі пацярпелі другое запар паражэнне ў матчах адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы-2016.*** У гульні другога тура спаборніцтваў камандаў 1-й кваліфікацыйнай групы беларускі на пляцоўцы мінскага Палаца спорту прайгралі гандбалісткам Румыніі з лікам 23:25.

Нагадаем, у першым туры адбору румынская каманда перамагла на сваёй пляцоўцы зборную Літвы — 29:20, а беларускі ўступілі дзейным чэмпіёнам Еўропы і Алімпійскіх гульняў гандбалісткам Нарвегіі з лікам 24:35.

Становішча камандаў: Нарвегія — 4 ачкі (розніца мячоў — 63-45), Румынія — 4 (54-43), Беларусь — 0 (47-60), Літва — 0 (41-47).

Пропуск у Швецыю, дзе ў снежні 2016-га адбудзецца фінал чэмпіянату кантынента, атрымаюць па дзве найлепшыя дружыны з 7 адборачных груп.

***3. Беларускі баксёр Сяргей Хаміцкі стаў часовым чэмпіёнам свету па версіі WBA ў сярэдняй вагавой катэгорыі.*** У паядынку за тытул ён біўся з венесуэльцам Альфонса Бланка. Паядынак скончыўся перамогай Хаміцкага аднагалосным рашэннем суддзяў.

***4. Мужчынская зборная Беларусі прайграла ў трэцім матчы чэмпіянату Еўропы па валейболе нацыянальнай камандзе Польшчы —*** 0:3 (13:25, 19:25, 17:25) і завяршыла выступленне на турніры.

Перад гэтым беларусы пацярпелі паражэнне ад Славеніі (0:3) і Бельгіі (0:3), такім чынам, занялі чацвёртае месца ў квартэце С.

Нагадаем, на чэмпіянаце Еўропы 2013 года нашы хлопцы таксама не змаглі выйсці з групы, заняўшы па выніках 15-е месца ■

# Гульня з іскрай

## Наша зборная перамагла славакаў

**Напярэдадні передапошняга матча ў адборачным цыкле чэмпіянату Еўропы 2016 года, які нашы футбалісты правялі ў Жыліне, Аляксандр Хацкевіч заявіў, што «ў матчы са славакамі вы ўбачыце нешта новае». І настаўнік, і яго падапечныя стрымалі слова і сапраўды паказалі зусім іншы футбол.**

...На чацвёртай дабаўленай хвіліне Марцін Шкртэл упаў на калені ва ўласнай штрафной, замахнуўся і чатыры разы смачна ўдарыў кулаком па газоне. Гэта быў жэст бяссілля — за секунды да істэрыкі абаронцы «Ліверпуля» варатар зборнай Беларусі Андрэй Гарбуноў чарговы раз выратаваў беларусаў ад гола. «Аказалася, што наша каманда безадказна падышла да матча. У першай палове гульні не змаглі супрацьстаяць беларусам. Сапернік аказаўся на самай справе моцным, я нават здзіўлены», — прызнаваўся пасля гульні трэнер славакаў Ян Козак.

Сітуацыя складвалася не вельмі радасная: па-першае, амаль палову гульні правялі ўдзесяцёх, па-другое — на чужым полі, а па-трэцяе — супраць зборнай, у складзе якой ёсць гульцы славутых і грозных еўрапейскіх камандаў — «Ліверпуля», «Напалі» і «Мілана».

А ў нашых тым часам з абоймы здаровых футбалістаў следам за Глебам, Шытавым, Бегуновым, Калачовым, Маеўскім і Карніленкам выпаў і Ягор Філіпенка.

Букмекеры і футбольныя спецыялісты яшчэ да пачатку матча прадракалі беларусам паражэнне. Да гэтага іх прымушалі не толькі траўмы лідараў нашай зборнай, але і тое, што славакі перад пятнічнай гульнёй былі звышматываваныя. Гэта быў іх шанц датэрмінова аформіць выхад на Еўра-2016 ды яшчэ зрабіць гэта дома, на вачах у сваіх балельшчыкаў.

Беларусы ж пазбавіліся турнірнай перспектывы яшчэ пасля матча са зборнай Украіны, але гэта не перашкодзіла ім змагацца за пераможны вынік у канкрэтным матчы са славакамі. Каманда дзейнічала па прынцыпе «чым горш, тым лепш»: ні дэфіцыт выканаўцаў, ні чырвоная картка (пасля другога на працягу сямі хвілін папярэджання) Мартыновіча на 65-й хвіліне не перашкодзілі нашым суайчыннікам аформіць перамогу — 1:0.

Адзіны мяч у сустрэчы забіў Станіслаў Драгун, крыху пазней ён жа адзначыўся і ўдалай гульнёй каля сваіх варот, калі адбіў мяч, які ўжо перасякаў лінію. Некалькі невераГодных сэйваў здзейсніў варатар Андрэй Гарбуноў, ды і ў цэлым зборная паказала агрэсіўную, накіраваную на вынік гульню.

**Галоўны трэнер зборнай Беларусі Аляксандр ХАЦКЕВІЧ:**

*— У нас многае атрымлівалася і ў пачатку гульні, і на працягу ўсяго першага тайма, і ў другім, да выдалення. Мы згулялі ў агрэсіўны футбол, ён прынёс нам вынік.*

*Выдаленне Мартыновіча паўплывала на гульню, але не на вынік, гэта самае галоўнае. Астатняе — умоўны лад. Мы пачалі і другі тайм вельмі актыўна. Зразумела, што ўвесь час прэсінгаваць і гуляць на чужой палове поля цяжка. Але фрагментарна мы гэта рабілі і пасля перапынку. Так, нам трэба было перастроіцца, да таго ж Коля Сігневіч папрасіў замену, сталі гуляць без нападаючых. Потым пайшоў прымітыўны футбол, небяспечныя моманты былі каля нашых варот, але асабліва славакі не напружвалі, а наш варатар выручаў.*

**Паўабаронца зборнай Беларусі Рэнан БРЭСАН:**

*— Гэта была добрая гульня ў нашым выкананні. Думаю, калі б не выдаленне, змаглі б забіць і другі мяч. Але галоўнае, што перамаглі і паказалі, на што здольная зборная. Шкада, вядома, што шанцаў на выхад з групы ў нас няма.*

**Паўабаронца зборнай Славакіі Роберт Мак:**

*— У мяне была выдатная магчымасць. Ужо бачыў мяч у варотах, але яго нейкім чынам дасталі з лініі. Нічога не зробіш, але мы не дамагліся мэты. Лік 0:1 склаўся з мноства фактараў. Да прапушчанага мяча дзейнічалі разнастайна, нядрэнна абараняліся. Пасля ўся лёгкасць кудысьці сышла. Магчыма, занадта асцярожна згулялі ў другім тайме. Усё гэта расчароўвае, таму што каманда хацела скончыць з усім дома ў Жыліне. Цяпер едзем у Люксембург — найважнейшы матч у кваліфікацыі, абавязаны там перамагчы.*

Пройгрышам славакаў скарысталіся ўкраінцы, якія ў гасцях змаглі абыграць македонцаў (2:0) і зраўняцца па ачках са славацкай дружынай. Лідар групы С, зборная Іспаніі, без праблем разабралася з камандай Люксембурга — 4:0 і забяспечыла сабе пуцёўку на Еўра-2016.

Нагадаем, у фінальную частку Еўра-2016 выйдуць каманды, якія занялі 1-2-е месцы ў дзевяці кваліфікацыйных групах, а таксама найлепшая са зборных, якія занялі 3 месцы (па дадатковых паказчыках). Астатнія 8 камандаў, якія фінішуюць трэцімі, правядуць стыкавыя матчы, вызначыўшы яшчэ чатырох удзельнікаў фінальнага турніру кантынентальнага першынства.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



pressball.by

■ Далучайцеся!

# РАЗМІНКА ДЛЯ РОЗУМУ

«МазгаБойня» — гэта ўжо даўно не проста «віктарына ў кавярні». «Псеўдаінтэлектуальныя вячоркі будзённага дня» — менавіта так, з гумарам, кажуць пра гульню яе стваральнікі

**Абстрагавацца ад мітусні, клопатаў, праблем за ўтульным месцы збіраюцца людзі розных узростаў. Незвычайная гульня нагадвае «Што? Дзе? Калі?», але яна не такая афіцыйная, падобная да «Брэйн-рынгу», але больш масавая і вясёлая. Ды наогул, лепш не параўноўваць адно з адным, а проста ўсё пабачыць на свае вочы. І я накіравалася ў адзін з мінскіх клубаў — там якраз распачаўся дзявяты сезон «МазгаБойні».**



Фота Віталя МАЦУСЕВІЧА.

## АДНАК, АЖЫЯТАЖ!

Пачатак а 19-й гадзіне. Каб заняць сабе месца, прыйшла ў клуб загадзя.

*— Вечар добры! Вы з якой каманды?* — пытаецца дзяўчына на ўваходзе.

*— Не, я так, паглядзець*, — адказваю я і думаю: ну вось, зараз «пагоняць» дадому.

*— Тады, калі ласка, займайце месца вось тут, каля барнай стойкі, — усе столікі ў нас для камандаў. Зрэшты, чаму вы будзеце проста так сядзець? Праверце свае веды!* — дзяўчына працягвае мне бланкі для адказаў.

Пашанцавала. Бяру лісточкі і спрабую адшукаць ручку. А людзі тым часам ідуць вялікай і бурнай плынню. Больш за іх — маладыя хлопцы і дзяўчаты, але я бачу людзей і сталага ўзросту, а вось белае дзяўчынка гадоў шасці. Як высвятляецца, абмежаванняў па ўзросце тут няма.

*— «Міс Жытомір — 96»? Праходзьце прама і направа, ваш столік там.*

«Нічога сабе, удзельнікі!» — думаю я і кручу галавой у пошуку той самай «міс». А, усё зразумела. Гэта такая назва каманды. Экспрэсіўна і арыгінальна, аднак. У прынцыпе, як і ў астатніх: «Метад тыку», «Ловім акуня», «Слон Генадзь», «Граф Кацейка», «Мякаць граніта навукі», «ДрымТым», «Месяцовы цукар», «Абы-хто»... Фантазіі камандам не займаць.

Кожная каманда займае месца за сваім столікам. Там можа сядзець адзін чалавек, а можа і дванаццаць, але ў сярэднім месціцца па пяць-сем. У памяшканні становіцца горача, тут ужо сабралася больш за некалькі сотняў удзельнікаў.

Вядучы віншуе ўсіх з адкрыццём сезона і без пафаснай прадмовы пачынае гульню.

## ПАД... АЗАРТАМ

У гульні сем тураў, у кожным па сем пытанняў. Гучыць першае:

*— Як вядома, чорны квадрат Малевіча — частка трыпціха. Назавіце астатнія работы з гэтай серыі.*

Усе кінуліся раіцца, разважаць, прапаноўваць. Уключаюся і я: так, зараз узгадаю, узгадаю, мы ж праходзілі гэта на мастацтвазнаўстве. Бінга! Там яшчэ былі круг і крыж! Пішу адказ, а следам гучыць ужо іншае пытанне.

*— Як перакладаецца на латынь «звычайны караблік»? (унізе змешчаны падказкі — выява ракавінкі і фотаздымак мужчыны).*

Не, гэтага я ўжо дакладна не ведаю. Застаецца хіба што прасіць дапамогі ў Гугла, але гэта не па правілах...

Хутка праходзіць першы тур, адзначаю, што пытанні былі не на веды, а на логіку і інтуіцыю. Агучваюць правільныя адказы. Высвятляецца, што «карабельчык» перакладаецца як... «Наўтылус Пампіліус»!

Тур другі. Камандам прапануюць падборку навін. На экран выводзяць фотаздымак саліста гурта «Mband», які нядаўна выступаў у Мінску. У яго вялікі «ліхтар» пад вокам. Пытанне — чаму? Народ смяецца і хуценька запаўняе карткі. Відаць, што большасць ведае. Адказ такі: гэта «падарунак» ад фаната, які шпульнуў у спевака бульбіну. Чым далей, тым цікавей.

Трэці этап — музычны. На сцэне з'яўляецца гурт «Artefact». Са сцэны льюцца песні «Moby», «Roxette», «HI-FI» і «Песняроў». І пакуль я магу сядзець і атрымліваць асалоду ад міні-канцэрта, удзельнікам трэба варушыць звілінамі.

*— Калі вы не пазнаеце гэтую песню, нам будзе крыўдна,* — кажа саліст гурта.

Прызнаюся, я не пазнала. Як высветлілася пасля, гэта быў уласны хіт выступоўцаў.

Вядучы жартуе:

*— Хлопцы, вас тут з «Бітламі» параўналі — ганарыцеся!*

Пасля музычнага штурму — невялікі перапынак і прамежкавыя вынікі. Пакуль у лідарах «Граф Кацейка», але яшчэ, як кажуць, не вечар.

## САКРЭТ ПОСПЕХУ

Вылаўляю адну з удзельніц інтэлектуальнай «вечарыны». Марына прызнаецца, што на гульню трапіла выпадкова два гады таму, але ёй так спадабалася, што ўжо сёння яна прыйшла сюды з уласнай камандай — «Увядзіце назву».

*— У сённяшнім імклівым жыцці складана знайсці час на сустрэчы з сябрамі. «МазгаБойня» вырашае гэтую праблему. Падчас гульні з кучы варыянтаў трэба вылучыць галоўныя і скласці з іх пазл. Таму пастаянна трэба быць у тонусе: глядзець навіны, слухаць музыку, цікавіцца мастацтвам, чытаць кнігі. Гульня, бясспрэчна, развівае.*

Гучаць пытанні на веданне паэзіі, гісторыі, мастацтва, геаграфіі (прычым як «далёкай» — адгадаць, якая краіна на карце, так і «мясцовай» — назваць вуліцу Мінска, дзе месціцца пэўны будынак). Крыху адрозніваецца апошні тур — бліц. Там пытанні карацейшыя і часу на адказы даецца менш.

Глянула на гадзіннік — 21.00! Час праляцеў імгненна. Падлічваюцца вынікі. Перамагла каманда «5 сек». Для іх — невялікі падарунак ад арганізатараў. Зрэшты, дзе яны? Знаёмлюся з Кацярынай Максімавай (дзяўчынай, якая сустракала ўдзельнікаў на ўваходзе) і Аляксандрам Ханіным (вядучым мерапрыемства).

***— Як з'явілася ідэя гульні?***

*— Ідэя пытанняў і адказаў не новая ў свеце. Многія лічаць, што «МазгаБойня» — поўная копія літоўскай гульні, але памыляюцца. Фармат нашай «МазгаБойні» прыдумвалі мы самі — канцэпцыю, назву, паслядоўнасць... Дзякуй Богу, паспелі ў свой час зарэгістраваць гандлёвую марку і лагатып. Зрэшты, нам ужо хутка споўніцца чатыры гады. І нас усё больш і больш.*

***— Ведаю, што геаграфія гульні ўжо выйшла за межы Беларусі...***

*— Так. Дзесяці праз тыдзень з «МазгаБойняй» пазнаёміцца ў Берліне, а таксама ў Львове і ў Кіеве. Ужо даўно гуляюць і ў Расіі. Мы ўжо не кажам пра Беларусь! Тут гуляюць ва ўсіх вялікіх гарадах, акрамя хіба што Наваполацка ды Мазыра, але гэта, мы ўпэўнены, толькі пытанне часу.*

***— Зрэшты, як трапіць у вашу «тусоўку»?***

*— Трэба толькі жаданне. А далей збіраеце каманду ды рэгіструецеся на гульню. (Гэта можна зрабіць у нашай суполцы ў кантакце https://vk.com/mozgoboj.) Ажыятаж вакол яе вялікі. Таму размяркоўваем спісы на гульню па днях і месяцах, пры гэтым максімальна ўлічваем пажаданні гульцоў.*

***— А саму гульню доўга рыхтуеце?***

*— Тут важна зачапіцца за цікавае. Вось ідзеш па вуліцы — чуеш класную песню і думаеш: так, трэба яе ў музычны тур. А ўжо афармленне, тэхнічныя пытанні вырашаем за тыдзень да гульні. «МазгаБойня» — наш маленькі мастацкі твор. Мы ў яе ўкладваем душу, і людзі гэта адчуваюць, таму з кожным годам нас становіцца больш. Зрэшты, збіраемся мы з кастрычніка па чэрвень. Кожная гульня праходзіць за тры-чатыры дні ў некалькіх установах. Кошт удзелу ў ёй сёння — 50 тысяч рублёў з чалавека.*

Дзякую ім за цудоўны вечар. Ведамі падсілкавалася, музыку паслухала, адным словам, адпачыла з карысцю. Раю і вам самім у гэтым пераканацца.

**Хрысціна ХІЛЬКО** ■

# КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД



**Перакладзіце з рускай мовы на беларускую наступныя словы:**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Торговля. **6.** Сверчок. **8.** Листва. **11.** Тряпка, портянка. **12.** Существование. **14.** Почва. **15.** Хватит, довольно. **19.** Ватерпас, уровень. **20.** Карий (масть лошади). **22.** Усекать (отрубив, укорачивать). **23.** Тумак. **24.** Ворон.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Хлопок. **2.** Банка (стеклянная). **3.** Светофор. **4.** Крик, ауканье. **7.** Тяж (в повозке). **9.** Щель. **10.** Час. **13.** Спаситель. **16.** Статья. **17.** Костер, огнище. **18.** Отпечаток. **21.** Охвостье, мелкая солома (обл.).

**Склала Таццяна КУЗЬМІЧ.**
*г. Віцебск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ!**

**Па гарызанталі:** 5. Гандаль. 6. Цвыркун. 8. Лістота. 11. Ануча. 12. Існаванне. 14. Глеба. 15. Годзе. 19. Грунтвага. 20. Гняды. 22. Уцінаць. 23. Кухталь. 24. Крумкач.

**Па вертыкалі:** 1. Бавоўна. 2. Слоік. 3. Святлафор. 4. Гуканне. 7. Атоса. 9. Шчыліна. 10. Гадзіна. 13. Збавіцель. 16. Артыкул. 17. Агонь. 18. Адбітак. 21. Аціра.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.33 | 18.18 | 10.45 |
| Віцебск — | 7.24 | 18.06 | 10.42 |
| Магілёў — | 7.23 | 18.08 | 10.45 |
| Гомель — | 7.17 | 18.07 | 10.50 |
| Гродна — | 7.48 | 18.33 | 10.45 |
| Брэст — | 7.46 | 18.36 | 10.50 |

**Месяц**

*Маладзік у 2.05.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Аляксея, Вячаслава, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Рыгора.*
**К.** *Рэнаты, Даніэля, Эдуарда.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 13 КАСТРЫЧНІКА

**1800** год — 215 гадоў таму нарадзіўся (вёска Яварова Віленскага павета) Дамінік Цэзарый Ходзька, беларускі фалькларыст, этнограф, літаратар. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Член Віленскай археалагічнай камісіі. Збіраў і апрацоўваў беларускую вусную народную творчасць. Аўтар матэрыялаў пра рэкі Беларусі і Літвы. Супрацоўнічаў з А. Кіркорам, Я. і К.Тышкевічамі. Распрацоўваў біяграфію З. Даленгі-Хадакоўскага. Памёр у 1863 годзе.

**1925** год — нарадзілася Маргарэт Тэтчэр, англійскі палітык і грамадскі дзеяч, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі (1979—1990).



Яна ўвайшла ў сусветную гісторыю як «жалезная лэдзі» і першая жанчына на пасадзе прэм'ер-міністра ў гісторыі Вялікабрытаніі. Маргарэт Тэтчэр займала гэтую пасаду даўжэй, чым хто-небудзь у сучаснай Еўропе, і адзначыла сабой цэлую эпоху. Яе смеласць і ўпэўненасць у прыняцці палітычных рашэнняў, якія нават паплечнікам здаваліся неверагоднымі і немагчымымі, і далі ёй права стаць часткай сусветнай гісторыі. І, па сутнасці, яна стала першай жанчынай у палітыцы XX стагоддзя, якая перавярнула ўяўленні аб палітыцы як аб сферы дзейнасці толькі мужчын. Будучы кіраўніком урада, яна правяла шматлікія палітычныя і эканамічныя рэформы — яе палітыка грунтавалася на дэрэгуляцыі, у асаблівасці фінансавай сістэмы, забеспячэнні гнуткага рынку працы, прыватызацыі дзяржаўных кампаній і памяншэнні ўплыву прафсаюзаў. У знешняй палітыцы Тэтчэр шмат у чым арыентавалася на ЗША і гэтак жа з недаверам ставілася да СССР. Аднак яна адной з першых заходніх палітыкаў станоўча ацаніла рэфарматарскую дзейнасць Міхаіла Гарбачова ў СССР, і ў лістападзе 1988 года, за год да падзення Берлінскай сцяны, заявіла аб закончэнні халоднай вайны. Пасля сваёй адстаўкі Тэтчэр стала членам палаты лордаў і даволі доўга заставалася дзейным палітыкам. Ёй прысвоілі асабістае дваранства з тытулам баранэсы і герб. Яна з'яўляецца аўтарам кнігі «Майстэрства кіравання дзяржавай: стратэгіі для свету, які змяняецца». Маргарэт Тэтчэр памерла 8 красавіка 2013 года ва ўзросце 87 гадоў. Прычынай смерці «жалезнай лэдзі» стаў інсульт.

**1949** год — нарадзіўся (вёска Заеліца Глускага раёна) Анатоль Данілавіч Смычнік, беларускі вучоны ў галіне горназдабыўнай прамысловасці, член-карэспандэнт НАН Беларусі (2009), доктар тэхнічных навук, прафесар (2005). Працаваў у Беларуськаліі, у Беларускім філіяле Усесаюзнага навукова-даследчага і праектнага інстытута галургіі, з 1993 года — дырэктар Белгархімпрама, адначасова прафесар, загадчык кафедры «Горныя работы» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Аўтар навуковых даследаванняў па распрацоўцы і ўкараненні рэсурсазберагальных тэхналогій здабычы і перапрацоўкі сільвінітных руд на Беларуськаліі, новых тэхнічных рашэнняў па складзіраванні і ўтылізацыі адходаў розных вытворчасцяў, накіраваных на паляпшэнне экалагічнай абстаноўкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2008).

**Было сказана**

**Нэлі ТУЛУПАВА, паэтэса:**
*Нам не дадзена двойчы жыць,*
*Але дадзена нам неўміручасць.*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Паслухай, мне патрэбна твая дапамога. Ты можаш гэта зрабіць? Хаця не — лепш я сама! Усё роўна ты нічога нармальна не зробіш, усё вечна прыходзіцца рабіць самой! Усё, я на цябе пакрыўдзілася...**

Фатаграфаваў вечарам дарогу. Стаў на ўзбочыне, усталяваў штатыў. Ніколі не бачыў, каб машыны тут ездзілі так павольна.

**Сэрца рыбака Сямёна ледзь не спынілася, калі ён убачыў, што сом мала таго што сарваўся, дык яшчэ і зачапіў сетку гарэлкі, якая астуджалася ў рацэ.**

Хірург:
— Каб выцягнуць цвік з вашай галавы, вам давядзецца заплаціць дзвесце тысяч.
— Але ў мяне ж поліс!
— Па полісе можам загнуць, каб не перашкаджаў.

**— Леанід, а што вы рабілі з трыма асістэнткамі ў лабараторыі?**
**— Нічога...**
**— А чаму тады на вас трус глядзіць з такой павагай?..**



caricatura.ru




## Ідавочцы ДТЗ, адгукніцеся!

2 кастрычніка прыкладна ў 21 гадзіну невядомы вадзіцель, кіруючы неўстаноўленым аўтамабілем і рухаючыся па 2-м кіламетры аўтадарогі Мінск — Азярышча — Глебкавічы з боку пасёлка Калодзішчы ў кірунку Мінска, здзейсніў наезд на пешахода-мужчыну, які знаходзіўся на праезнай частцы. Апошні ад атрыманых цялесных пашкоджанняў памёр на месцы здарэння.

Мінскі раённы аддзел Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь пераканаўча просіць відавочцаў гэтага здарэння аказаць дапамогу ва ўстанаўленні ісціны па дадзеным факце і звязацца па тэлефонах: 267 45 27 ці 8 029 359 17 05 (Velcom), 8 025 769 35 89 (Life). Або па адрасе: г. Мінск, вул. Ф. Скарыны, 20, каб. №48.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.654. Індэкс 63850. Зак. № 4097.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 кастрычніка 2015 года.